Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

23 ЛІПЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 138 (27996) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Разважанні пра сучаснасць: Павел Марыеў

СТАР. 4

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

Milki: «Трэба верыць у свае сілы!»



Быць у сядле!

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй РАЎКОЎ, міністр абароны:

«ДТСААФ павінна заняць сваё месца ў падрыхтоўцы спецыялістаў для новых відаў узбраення і тэрытарыяльнай абароны. Сёння ў краіне вялікая ўвага надаецца тэрытарыяльнай абароне. Думаецца, ДТСААФ павінна рыхтаваць спецыялістаў і ў гэтым напрамку. У нас ужо наладжана цеснае і эфектыўнае ўзаемадзеянне з ДТСААФ па падрыхтоўцы спецыялістаў для авіяцыі, сіл спецыяльных аперацый, сувязі, радыёэлектроннай барацьбы. Мы будзем развіваць гэтае супрацоўніцтва і далей. Вырашаючы з арміяй сумесныя задачы, ДТСААФ Беларусі актыўна ўдзельнічае ў падрыхтоўцы краіны да абароны. Штогод у арганізацыях абароннага таварыства атрымліваюць падрыхтоўку тысячы спецыялістаў».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.07.2015 г.

Долар ЗША	15197,00	▼
Еўра	16615,00	▲
Рас. руб.	266,22	▼
Укр. грыўня	687,65	▼

ISSN 1990 - 763X

НЕ СВЯТЫЯ ГАРШКІ ЛЕПЯЦЬ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Гаспадар аграсядзібы ў вёсцы Навасёлкі Пастаўскага раёна Сяргей ШЧЭРБА ўжо больш за 20 гадоў займаецца ганчарствам па старажытных тэхналогіях. Ён пастаянны ўдзельнік розных фестываляў, прапагандуе сваё рамяство, перадае вопыт нават на майстар-класах, якія ладзіць непасрэдна на месцы.

Напрыклад, дзесяцігадовая жыхарка Віцебска Настасся ЗАЙЦАВА атрымала першы ўрок ад вядомага ганчара падчас музычнага фестывалю ў Паставах.

■ Жыллё

ВЯРНУЦЬ ЯК МІНІМУМ ТОЕ, ШТО ЎКЛАДЗЕНА

Кампенсацыю дольшчыкаў «прывязалі» да стаўкі рэфінансавання

Гэтымі днямі ў нашай краіне змяняецца парадак вяртання грошай грамадзянам пры іх выхадзе з долевага будаўніцтва, спыненні членства ў арганізацыі забудоўшчыкаў і скасаванні дагавораў куплі-продажу жылых памяшканняў, пабудаваных па дзяржзаказе. Такі новы парадак прапісаны адпаведнай пастановай.

Дакументам вызначаецца, што цяпер памер грашовай кампенсацыі былому дольшчыку будзе залежаць ад стаўкі рэфінансавання, якая дзейнічала з даты ўнясення сродкаў дольшчыкам, членам арганізацыі забудоўшчыкаў да даты іх вяртання па спецыяльнай формуле. Такім чынам, калі чалавек уносіць тыя 100 млн рублёў і праз год выходзіць з будаўніцтва, то ён атрымае гэтую суму, памножаную на стаўку рэфінансавання плюс пэўны каэфіцыент. У выніку такога алгарытму выдаткі кліенту будуць і сапраўды кампенсаваныя.

СТАР. 2

■ Ці чулі?

У ЧАКАННІ ПРАЗМЕРНАЙ СПЯКОТЫ

Як на нашай краіне адбіліся самыя гарачыя шэсць месяцаў у гісторыі

Літаральна ўчора ўсе найбуйнейшыя інфармацыйныя агенцтвы «ўзарваліся» сенсацыйнай навіной пра тое, што першае паўгоддзе 2015-га было самым гарачым за ўсю гісторыю інструментальных назіранняў.

НАГРЭЎСЯ АКІЯН

Эксперты Сусветнай метэаралагічнай арганізацыі (СМА) канстатуюць, што сярэдняя тэмпература, у тым ліку паверхні акіянаў, была на 0,85% вышэй за сярэднюю тэмпературу ў XX стагоддзі, якая складала 15,5 градуса Цэльсія.

Незвычайна высокія тэмпературы назіраліся практычна ва ўсёй Еўразіі, Паўднёвай Амерыцы, Афрыцы, Аўстраліі і на захадзе Паўночнай Амерыкі. Спецыялісты-кліматолагі са спасылкай на Цэнтр навін ААН паведамляюць, што цяпер больш за ўсіх ад спёкі пакутуюць Балканы і Паўднёвая Еўропа. На думку экспертаў, высокія тэмпературы будуць трымацца і надалей. Так, ва ўсходніх і паўднёвых раёнах ЗША спякота не збіраецца спадаць і дасягае гэтымі днямі 38-40 градусаў.

БЕЛАРУСЬ ГАРАЧЫНЁЙ НЕ СПУЖАЕШ

Як бачым, наша планета сёлета і сапраўды моцна нагрэлася і пачынае біць усе ранейшыя рэкорды.

СТАР. 3

БЯЗВІЗАВЫ ТРАНЗІТ

Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які ўстанаўлівае для грамадзян Кітайскай Народнай Рэспублікі бязвізавы парадак уезду і выезду, а таксама транзітнага праезду (транзіту) праз тэрыторыю Беларусі і часовага знаходжання ў краіне на тэрмін да трох сутак. Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

Такі парадак прадугледжаны для грамадзян КНР, якія прыбываюць прамымі авіярэйсамі з аэрапортаў краіны грамадзянскай прыналежнасці, пры наяўнасці ў дзейным дакументе для выезду за мяжу дзеючай візы дзяржаў — членаў Еўрапейскага саюза або дзяржаў — удзельніц Шэнгенскай зоны.

ПЛЮС НОВЫЯ ПРАЦОЎНЫЯ МЕСЦЫ

Аляксандр Лукашэнка падпісаў указ, які прадугледжвае стварэнне буйнога мультымадальнага прамыслова-лагістычнага цэнтра ў пасёлку Балбасава Віцебскай вобласці.

Гэты комплекс стане буйным парталам для размяшчэння вытворчасцяў па апрацоўцы сыравіны, перавалцы грузаў, каардынацыі ўзаемадзеяння розных відаў транспарту, каротказтэрміновага і доўгатэрміновага захоўвання тавараў.

Нормы дакумента накіраваны на развіццё лагістычнай сістэмы краіны, павышэнне яе транзітнай прывабнасці. Рэалізацыя ўказа дасць магчымасць павялічыць прыток валютных паступленняў і падатковых плацяжоў, а таксама дадаткова стварыць не менш за 400 працоўных месцаў і вырашыць праблему занятасці ў рэгіёне.

ПРЭЗІДЭНТ НАВУЧЫЎ ДЭПАРДЗЬЕ КАСІЦЬ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з вядомым французскім акцёрам Жэрарам Дэпардзье, які прыехаў у Беларусь, каб асабіста пазнаёміцца з нашай краінай і вядзеннем у ёй сельскай гаспадаркі.

Аляксандр Лукашэнка і Жэрар Дэпардзье ў нефармальнай абстаноўцы пагутарылі на тэмы падтрымкі сельскай гаспадаркі ў сучасным свеце, развіцця тэхналогій па вырошчванні экалагічна чыстых прадуктаў харчавання. Былі таксама закрануты магчымыя перспектыўныя праекты супрацоўніцтва Беларусі і Францыі ў галіне культуры і мастацтва.

Кіраўнік дзяржавы правёў для Жэрара Дэпардзье кароткую экскурсію па тэрыторыі афіцыйнай рэзідэнцыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Азёрны» ў Астрашыцкім Гарадку, азнаёміў з некаторымі ўзорамі айчыннай сельскагаспадарчай тэхнікі, навучыў навыкам ручной касьбы, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

■ Прафсаюзны рух

ПРАБЛЕМЫ РАЗМЕРКАВАННЯ І ЗАМЕЖНАЙ АДУКАЦЫІ

цікавяць моладзь з розных краін

Магчымасць абмеркаваць іх мелі ўдзельнікі міжнароднага маладзёжнага прафсаюзнага адукацыйнага форуму «Тэмп—2015». Студэнты і рабочыя не толькі нашай краіны, але і яшчэ сямі дзяржаў, сярод якіх Расія, Малдова, Кіпр і іншыя, змаглі задаць намесніку кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Ігару БУЗОЎСКАМУ найбольш актуальныя для іх пытанні.

Так, студэнтка Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта Варвара Бабашка пацікавілася, ці чакаюцца змены ў сістэме размеркавання, якога так баяцца многія навучэнцы. «Размеркаванне, як правіла, не падабаецца тым, каго адпраўляюць у рэгіёны, — адзначыў Ігар Бузоўскі. — Таму трэба добра вучыцца, каб мець магчымасць выбіраць месца адпрацоўкі. Сістэму часам крытыкуюць, але ж размеркаванне — гэта гарантыя, што малады спецыяліст будзе ўладкаваны адразу пасля заканчэння ВНУ ці каледжа. У Еўропе сёння знайсці працу няпроста. Ёсць яшчэ і паняцце дзяржзаказу. Людзі, якія плацяць падаткі, маюць права на бясплатную медыцыну, адукацыю, дзе патрэбны прафесіяналы. І з бюджэту выдаткоўваюць грошы на падрыхтоўку гэтых спецыялістаў. Не хочаш размяркоўвацца — заплаці за сваё навучанне і выбірай любое месца працы».

Моладзь з Малдовы хацела даведацца, як у Беларусі наладжана супрацоўніцтва паміж прафсаюзамі і ўрадам у галіне заканатворчасці і ці можа аб'яднанне паўплываць на прыняцце таго ці іншага дакумента. **Старшыня ФПБ Міхаіл ОРДА**, які таксама прысутнічаў на сустрэчы, узгадаў, што ў нас дзейнічае Нацыянальны савет па працоўных і сацыяльных пытаннях. Гэты савет дапамагае ўраду, наймальнікам і прафесійным аб'яднанням знаходзіць кампрамісы пры разглядзе спрэчных момантаў. «Мы дамагліся таго, што цяпер урад, калі вырашае праблемы, што тычацца сацыяльнай сферы, абавязкова ўзгадняе свае дзеянні з Федэрацыяй прафсаюзаў», — паведаміў Міхаіл Орда. Ігар Бузоўскі дадаў, што без прафсаюзаў наладзіць камунікацыю паміж калектывамі і кіраўніцтвам дзяржавы было б нашмат складаней: «Можна выходзіць на вуліцу з транспарантамі і такім чынам адстойваць правы, аднак эфектыўней, калі рашэнне прымаецца праз дагавор».

Фота БЕЛТА.

У цэнтры ўвагі аказаліся таксама адукацыйныя магчымасці. Прадстаўнік Федэрацыі прафсаюзаў Рэспублікі Казахстан Руслан Карташоў спытаў аб праграмах па абменах студэнтамі паміж Казахстанам і Беларуссю. Ігар Бузоўскі паведаміў, што такія праграмы ёсць, але пакуль гэта асобныя пагадненні на ўзроўні пэўных ведамстваў. Абмен студэнтамі патрабуе значных фінансавых выдаткаў, таму ці будзе супрацоўніцтва ў галіне адукацыі развівацца, залежыць ад яго эфектыўнасці. Гэта не турыстычныя паездкі за дзяржаўныя грошы: удзельнічаць у падобных праграмах павінны найлепшыя студэнты, якія змогуць потым на працы прымяніць замежны вопыт.

Па-ранейшаму грамадства хвалююць жыллёвыя пытанні. «Несправядліва, што, калі ты атрымліваеш арэндную кватэру, цябе здымаюць з чаргі. Гэтае ж жыллё не прыватызуецца», — выказала незадаволенасць сваіх маладых калег старшыня Рэспубліканскага камітэта Беларускага прафсаюза работнікаў хімічнай, горнай і нафтавай галін прамысловасці Святлана Клачок. Намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта запэўніў, што гэту праблему абмяркоўваюць на ўзроўні ўрада і ў найбліжэйшы час будзе прынята рашэнне.

Вынікамі сустрэчы Ігар Бузоўскі застаўся задаволены:

— Я бачу, што моладзь сочыць за сітуацыяй у краіне і не адарвана ад праблем, якія ёсць у грамадстве. Спадзяюся, што прафсаюзны рух будзе папаўняцца маладзёжным актывам. Сёння для развіцця дзяржаў на постсавецкай прасторы патрэбны інавацыйныя метады працы. Прарыўныя ідэі цяперашніх студэнтаў і выпускнікоў будуць карысныя і асобным прадпрыемствам, і краіне ў цэлым.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.
lubneuskaya@zviazda.by

■ Парламенцкі дзённік

ЗАНЯТАСЦЬ — У ПРЫЯРЫТЭЦЕ

разам з экспартам і інвестыцыямі

Пра гэта на пасяджэнні Баранавіцкага райвыканкама казаў старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Міхаіл МЯСНІКОВІЧ.

«Прыярытэтнымі ў эканамічнай палітыцы нашай краіны сёння з'яўляюцца, на мой погляд, тры важныя пытанні — экспарт, занятасць і інвестыцыі. Калі раней пытанні занятасці былі недзе ў цені, то цяпер яны выходзяць на паверхню. І яны павінны быць на парадку дня ўсіх кіраўнікоў — і раённых, і абласных, і кіраўнікоў прадпрыемстваў», — падкрэсліў ён.

У час пасяджэння быў разгледжаны шэраг пытанняў, у прыватнасці, вынікі сацыяльна-эканамічнага развіцця Баранавіцкага раёна за I паўгоддзе 2015 года. Гаворачы аб занятасці насельніцтва, Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што Баранавіцкі раён стварае недастатковую колькасць новых працоўных месцаў.

Старшыня Савета Рэспублікі адзначыў, што раён мае пэўныя поспехі, у першую чаргу — у сельскай гаспадарцы. Міхаіл Мясніковіч растлумачыў, што прыняты шэраг рашэнняў у гэтай сферы, напрыклад, забарона авансавання гаспадаркам пад будучае малако. «Вядома, будуць нейкія пэўныя выключэнні, але яны павінны прымацца рашэннем выканкама. У Баранавіцкім раёне некаторыя гаспадаркі ўжо маюць авансы на 9 месяцаў наперад», — паведаміў Міхаіл Мясніковіч.

Старшыня Савета Рэспублікі таксама ўзяў удзел у нарадзе па працы праблемных прадпрыемстваў Брэсцкай вобласці. Паводле яго слоў, ужо выпрацаваны шэраг прапаноў як арганізацыйнага, так і фінансавага характару адносна праблемных прадпрыемстваў. «Ім трэба сур'ёзна займацца таксама пытаннямі мадэрнізацыі, падкрэсліваю, рэальнай мадэрнізацыі. На прадпрыемствах павінны разумець, які вынік будзе пасля мадэрнізацыі і наколькі паспяхова будзе прадавацца прадукцыя на рынках блізкага і далёкага замежжа», — растлумачыў Міхаіл Мясніковіч.

Яшчэ адным важным пытаннем стане абнаўленне схемы рэгіянальнага супрацоўніцтва. «Мы павінны зрабіць гэтую схему больш эфектыўнай і актывізаваць працу з рэгіёнамі Расіі, Кітая, Украіны, шэрагу іншых буйных дзяржаў», — канстатаваў ён.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

■ Выбары-2015

Семінары для ўдзельнікаў кампаніі

Учора ў краіне завяршылася фарміраванне тэрытарыяльных камісій па выбарах Прэзідэнта (усяго іх утворана 153). Пачынаецца навучанне ўдзельнікаў выбарчай кампаніі. Неабходнасць правядзення падобнай вучобы патлумачыў учора ў Гродне сакратар Цэнтрвыбаркама Мікалай ЛАЗАВІК.

«Кожная выбарчая камісія павінна быць гатова кампетэнтна працаваць з выбаршчыкамі, — заявіў ён. — Нягледзячы на тое, што ў склад камісій уваходзіць нямала грамадзян, якія ўжо маюць вопыт удзелу ў такіх кампаніях, усё ж людзям патрэбна адпаведная падрыхтоўка. З гэтай мэтай у першую чаргу ў рэгіёнах праводзяцца семінары для прадстаўнікоў тэрытарыяльных камісій, якія працуюць перш за ўсё з кандыдатамі, дакументамі. Наступным этапам стане навучанне ў раёнах прадстаўнікоў участковых камісій».

Мікалай Лазавік надаў важнае значэнне гэтаму этапу, бо ўчастковыя камісіі працуюць непасрэдна з выбаршчыкамі і сутыкаюцца на ўчастках з самымі рознымі сітуацыямі. «Людзі павінны ведаць, як рэагаваць, што рабіць у той ці іншай, самай непрадбачанай, сітуацыі», — падкрэсліў сакратар ЦВК.

Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў падкрэсліў, што ў гэтай выбарчай кампаніі ёсць шмат новаўвядзенняў, якія неабходна данесці і растлумачыць для ўсіх, хто ў ёй задзейнічаны. Ён запэўніў, што ў Гродзенскай вобласці будуць прыняты ўсе неабходныя захады для правядзення выбараў на высокім арганізацыйным узроўні.

Сёння пачынаецца збор подпісаў па вылучэнні кандытатаў у Прэзідэнты, які прадоўжыцца да 21 жніўня.

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА. *medvedeva@zviazda.by*

ВЯРНУЦЬ ЯК МІНІМУМ ТОЕ, ШТО ЎКЛАДЗЕНА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Начальнік упраўлення жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Аляксандр ГОРВАЛЬ патлумачыў, што асноўная задача новай пастановы — збалансаваць ацэнку ўзносаў грамадзян падчас будаўніцтва жылля і тых сум, якія ім выплачваюць, калі яны выходзяць з адпаведнага праекта. Менавіта для гэтага і ўведзены новы каэфіцыент індэксацыі. Нагадаю, што раней пры такім вяртанні грошай існавала прывязка да індэкса будаўніча-мантажных работ. Аднак ужо летась гэты індэкс пачалі лічыць па іншай методыцы, і часта ён быў меншы за 1. У гэтым выпадку атрымлівалася, што, калі чалавек умоўна ўносіў у будаўніцтва 100 млн рублёў, то пры выхадзе з яго гэтая сума множылася на памяншальны індэкс. Напрыклад, калі індэкс быў 0,9, то кліент атрымліваў толькі 90 млн рублёў. А гэта не зусім зразумела, бо мінулы алгарытм кампенсацыі ўвогуле не ўлічваў інфляцыю, удакладняюць сваю пазіцыю спецыялісты Мінбудархітэктуры.

У пастанове таксама гаворыцца, што цяпер пры разліку сумы, якая будзе вяртацца былому дольшчыку, усе плацяжы дзеляцца па крыніцах фінансавання ў вызначаным парадку. Пералік унесеных сум вядзецца па кожнай крыніцы фінансавання асобна з улікам даты паступлення грашовых сродкаў на спецыяльны бягучы рахунак забудоўшчыка.

Сяргей КУРКАЧ.
kurkach@zviazda.by

■ Ну і ну!

«АПОСТАЛ» З МАГІЛЁВА СТАРЭЙШЫ ЗА СКАРЫНАЎСКІ «ПСАЛТЫР»?

Дагэтуль ніхто не падвяргаў сумненню, што першая друкаваная кніга на беларускай мове называлася «Псалтыр» і была выдадзена Францішкам Скарынам у 1517 годзе ў Празе. Але нядаўна ўкраінская даследчыца Святлана Кагамлык паведаміла ў сваёй манаграфіі «Кіева-Пячэрская лаўра. Свет праваслаўнай духоўнасці і культуры» сенсацыйныя звесткі. Маўляў, у архівах Кіева-Пячэрскай лаўры захаваўся рэестр, складзены манахамі ў 1736-1744 гадах, дзе пазначана, што ў XVIII стагоддзі пры царкве Пакроў Прасвятой Багародзіцы ў вёсцы Ялуўка знаходзіўся «Апостал», які быў выдадзены ў 1504 годзе ў Магілёве.

Гэтае паведамленне адразу ж выклікала рэзананс. **Дырэктар музея гісторыі Магілёва Аляксей БАЦЮКОЎ** звязаўся з даследчыцай і атрымаў інфармацыю, што называецца, з першых рук. Сапраўды, такі гістарычны дакумент існуе, хтосьці нават насупраць яго напісаў здзіўленае «ого!». Святлана Кагамлык лічыць, што зроблена гэта рэмарка не менш за стагоддзе таму. Але трэба яшчэ, каб яе здагадкі пацвердзіла экспертыза.

— Наколькі гэтыя звесткі наогул могуць адпавядаць рэчаіснасці? — пацікавілася «Звязда» ў гісторыка.

— Пакуль гэта адзіны факт на карысць існавання такой кнігі, і зрабіць нейкія высновы, зыходзячы толькі з яго, нельга, — паведаміў ён. — Хутчэй за ўсё гэта нечая памылка. Або размова ідзе пра нейкі рукапісны варыянт. Тым не менш мы збіраемся правесці сваё даследаванне. Сябры-архівісты з Мінска нам у гэтым дапамогуць. Больш дэталёва разбярэмся ў гэтай сітуацыі, звярнуўшыся ў той самы прыход, на які робіцца спасылка. Мы ўжо думаем арганізаваць туды экспедыцыю.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

■ Добрая навіна

АМАЛЬ 8 ТЫСЯЧ КВАТЭР

Больш за палову было пабудавана за ўласныя сродкі

Паводле інфармацыі статыстычнага ўпраўлення Мінска, у першым паўгоддзі ў галоўным мегаполісе краіны было ўведзена ў эксплуатацыю 554,3 тысячы квадратных метраў агульнай плошчы жылля. Спецыялісты адзначаюць, што арганізацыямі ўсіх формаў уласнасці ў студзені—чэрвені тут было пабудавана 7693 кватэры.

Для гараджан, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, уведзена ў эксплуатацыю 173,7 тысячы квадратных метраў, або 31,3% ад агульнага аб'ёму пабудаванага жылля. З выкарыстаннем дзяржаўнай падтрымкі для гэтай катэгорыі грамадзян пабудавана 100,6 тысяч «квадратаў». Эксперты ўпраўлення паведамляюць, што за шэсць месяцаў года на будаўніцтва жылля ў Мінску выкарыстана 4 трлн 275 млрд рублёў інвестыцый у асноўны капітал, што складае 25% да агульнага аб'ёму інвестыцый. Пераважнай крыніцай фінансавання жыллёвага будаўніцтва ў сталіцы з'яўляюцца ўласныя сродкі насельніцтва (51,2% гэтых інвестыцый).

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

У ЧАКАННІ ПРАЗМЕРНАЙ СПЯКОТЫ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Аднак, як адзначыў карэспандэнту «Звязды» **намеснік начальніка Белгідрамета Анатоль ПАЛІШЧУК,** такой працяглай цеплынёй нашу краіну здзівіць можна толькі часткова. Так, у першым паўгоддзі сярэдняя тэмпература ў Беларусі склала плюс 6,5 градуса, што на 3 градусы вышэй за норму (норма першых шасці месяцаў года — 3,5 градуса).

Але сустракаліся ў пасляваенны час у нас і больш цёплыя перыяды. Напрыклад, сярэдняя тэмпература паветра ў першым паўгоддзі 1989 года была 7,4 градуса, у 1990-м — 7, а ў 2002-м — 6,9 цяпла. Так што, нічога дзіўнага, прыкладна раз на 20 гадоў надвор'е нас песціць працяглым цяплом. І не трэба драматызаваць сітуацыю, лічыць Анатоль Палішчук, бо «было б значна горш, калі б тэмпературны фон у нас стаў на 3 градусы ніжэйшы за кліматычную норму».

СУХІ ЧЭРВЕНЬ

У аддзеле клімату Белгідрамета нам паведамілі, што з ападкамі ў першай палове года не ўсё так адназначна, як з тэмпературай. За першыя шэсць месяцаў наша тэрыторыя атрымала 233 мм ападкаў пры норме 289 мм. На першы погляд здаецца, што недабор ад нормы ў 20% не такі і крытычны, але... Суперанамальным стаў чэрвень, калі за месяц у краіне выпала толькі 26 мм ападкаў, што складае ўжо 33% ад нормы па месяцы. Сіноптыкі падлічылі, што так мала дажджоў у чэрвені яны фіксуюць упершыню за апошнія 70 гадоў.

ХОЛАД У МАІ І ГЛЕБАВАЯ ЗАСУХА НА ГОМЕЛЬШЧЫНЕ

Нягледзячы на тое, што тэмпературны фон па першым паўгоддзі і быў вышэйшым за кліматычную норму, але гэтай вясной назіраўся неаднастайны тэмпературны рэжым, паведамілі нам у аддзеле аграметыяпрагнозаў Белгідраметцэнтра.

Менавіта ў красавіку і маі спецыялісты адзначалі даволі працяглыя перыяды халоднага надвор'я, што адбілася на тэрмінах пачатку пасяўных работ цеплалюбівых культур. У прыватнасці, пазней сёлета пачалі сеяць кукурузу, цукровыя буракі і бульбу. Недабор цяпла і вільгаці ў сярэдзіне вясны адмоўна паўплываў на фарміраванне ўраджаю траў першага ўкосу.

За чэрвень выпала 26 мм ападкаў, што складае 33% ад нормы. Так мала дажджоў у чэрвені сіноптыкі фіксуюць упершыню за апошнія 70 гадоў.

А ў чэрвені і першай палове ліпеня аграрыі амаль паўсюдна сутыкнуліся з сур'ёзнай глебавай засухай. Тады яна, галоўным чынам, назіралася на паўднёвым усходзе краіны. Так, у Гомельскай вобласці глебавая засуха з трэцяй дэкады мая гаспадарыла практычна на працягу двух месяцаў. А працяглая адсутнасць глебавай вільгаці ўжо цяпер адмоўна паўплывала на ўраджаі збожжавых і зернебабовых. Пацярпеў і лён, які звычайна інтэнсіўна расце менавіта ў чэрвені-ліпені.

ПАСЛЯ ДАЖДЖОЎ — І СОНЦА СЯБАР

За мінулы тыдзень на тэрыторыі краіны як след пасваволілі добрыя дажджы. Таму сітуацыя з вільгаццю глебы ў нас значна палепшылася. Эксперты Белгідраметцэнтра сёння ўпэўнены, што далейшае павелічэнне сярэднясутачных тэмператур толькі палепшыць умовы фарміравання ўраджаю цеплалюбівых культур. У першую чаргу сапраўднае цяпло цяпер патрэбна кукурузе, агуркам і таматам. А калі падсумаваць нашу размову з сіноптыкамі, то Анатоль Палішчук і сапраўды мае рацыю — добрае цяпло нам цяпер не перашкодзіць.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

Слова выратавальнае

Не скакаць з моста самагубцу ўгаварыў епіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан

Раніцай серады на ферму пешаходнага моста цераз Сож у цэнтральным парку Гомеля забралася маладая дзяўчына, якая, па словах сведкаў, збіралася закончыць жыццё самагубствам. Дарэчы, вышыня яго над ракой складае прыкладна 30 метраў, а падыходы завараны кратамі — каб пазбегнуць такіх сітуацый. І ўсё ж гэта не стала перашкодай для дзяўчыны, быццам бы, пакрыўджанай на сваю маці. Яе прыезду патэнцыяльная самагубца патрабавала і расказала гэта выратавальнікам, міліцыі і медыкам, якія спрабавалі адгаварыць грамадзянку ад кроку ў бездань.

Побач з мостам знаходзіцца епархіяльнае ўпраўленне, адкуль выйшаў епіскап Гомельскі і Жлобінскі Сцяфан. Ён падышоў да дзяўчыны і пераконваў яе спусціцца. Што канкрэтна казаў святар, не чуў ніхто, а ад каментарыяў уладыка адмовіўся. Але ж вынікам гутаркі стала тое, што праз некалькі хвілін дзяўчына самастойна злезла з фермы моста. **Прэс-сакратар Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС Ксенія ШЫНГІРЭЙ** паведаміла, што 20-гадовая жыхарка Гомельскага раёна часова нідзе не працуе. Цяпер праверкай надзвычайнага здарэння займаецца міліцыя.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *astashkevich@zviazda.by*

■ Гучная справа

СУРОВЫ ПРЫСУД ХУЛІГАНАМ

Днямі суд Маскоўскага раёна сталіцы вынес прыгавор у дачыненні да футбольных фанатаў па справе збіцця двух мінчан. У жніўні мінулага года ў раёне станцыі метро «Грушаўка» група маладых людзей ва ўзросце 24—26 гадоў пры дапамозе тэлескапічных дубінак нанесла пацярпелым цяжкія і менш цяжкія цялесныя пашкоджанні.

Як высветлілася падчас расследавання, хлопцаў збівалі ўдзельнікі нефармальнай каляфутбольнай групоўкі «Нававілка», якая ўваходзіць у фанацкі рух мінскага «Дынама» і прытрымліваецца пазіцый неанацызму. Як паведамляе МУС Беларусі, крымінальная справа скончылася вынясненнем прысуду па артыкулах Крымінальнага кодэкса «Хуліганства» і «Наўмыснае нанясенне цяжкіх цялесных пашкоджанняў»: лідар групоўкі асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі, тры актыўныя ўдзельнікі — на 9 гадоў, 3 гады — яшчэ аднаму з удзельнікаў. Асуджаныя маюць права абскардзіць рашэнне на працягу 10 дзён да ўступлення прысуду ў законную сілу.

Увогуле, прыязнасць да неанацызму характэрная для многіх каляфутбольных фанацкіх рухаў. Нядаўна ў суседняй Расіі балельшчыца ФК ЦСКА Вольга Кузькова была пазбаўлена прыза «Міс Абаянне Расійскай футбольнай прэм'ер-лігі» за фотаздымкі з рукой, ускінутай у нацысцкім салюце, якія дзяўчына размяшчала на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы «ВКонтакте».

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

■ Сацыяльны ракурс

СЯМ'Я, ДЗЕЦІ І ЛЮБОЎ

Гэта — аснова сэнсу жыцця для большасці мінчан

Такую выснову можна зрабіць на падставе вынікаў сацыялагічнага апытання, якое было праведзена ў сталіцы сярод жыхароў Мінска ва ўзроставым інтэрвале ад 15 да 44 гадоў Мінскім навукова-даследчым інстытутам сацыяльна-эканамічных праблем.

Сярод іншых прыярытэтаў таксама самарэалізацыя, адукацыя, здароўе, дапамога людзям, душэўны спакой, камфорт, вера. Цікава, што на пытанне: «Дзеля чаго вы жывяце?» толькі 19,3% апытаных адзначылі ў якасці аднаго з прыярытэтаў матэрыяльна забяспечанае жыццё; кар'еру і высокае становішча ў грамадстве — толькі 11,4%; багацце — 5,8%.

Адказваючы на пытанне: «Якія адносіны складваюцца ў вас у сям'і з мужам (жонкай)?» 62,3% мінчан адказалі, што ў іх дружная, згуртаваная сям'я («нам добра разам»), і 27,2% рэспандэнтаў адзначылі, што ў іх не заўсёды ўсё добра, але яны прывязаныя адно да аднаго. У 5,3% сем'яў кожны жыве сам па сабе.

Паводле атрыманых звестак, значную пагрозу для існавання сям'і ўяўляюць дэфармацыі яе маральна-псіхалагічнага клімату. На думку апытаных жыхароў сталіцы, істотнымі разбуральнымі фактарамі — тымі, што блакіруюць развіццё нараджальнасці, — выступаюць такія сацыяльна-псіхалагічныя з'явы, як хатні гвалт, п'янства і шлюбная нявернасць.

Падчас сацыялагічнага апытання мінчан рэпрадуктыўнага ўзросту былі зададзены тры падобныя пытанні для выяўлення ідэальнай, чаканай і запланаванай колькасці дзяцей. Першым пытаннем было: «Колькі дзяцей, на ваш погляд, павінна быць у ідэальнай сям'і?» Большасць рэспандэнтаў адзначылі наяўнасць дваіх дзяцей у ідэале, жаданнях і планах. Такім чынам, найбольш распаўсюджанай мадэллю сям'і для мінчан з'яўляецца двухдзетная сям'я.

У ідэальнай сям'і, на думку 84,7% апытаных, павінна быць абавязкова больш за адно дзіця. Пры гэтым кожны чацвёрты мяркуе, што ў ідэальнай сям'і павінна быць больш за трое дзяцей. Больш за 2/3 рэспандэнтаў (79,8%) у якасці жаданай для сябе назвалі сям'ю з дваімі і больш дзецьмі, а 74,5% плануюць мець дваіх і больш.

Пры правядзенні сацыялагічнага апытання была выкарыстана камбінаваная імаверная выбарка: шматступенная тэрытарыяльная выбарка з прымяненнем метаду стратыфікацыі адбору. Аб'ём выбаркі склаў 800 чалавек. Памылка выбаркі — да 3%.

Канстанцін ЛЮТКЕВІЧ

■ Разважанні пра сучаснасць

АДЧУЦЬ ГІГАНТА

Тэхнік-тэхнолаг навучыўся змагацца з цяжкасцямі, узначаліў завод і стаў Героем Беларусі

Гэта разумны і моцны чалавек, які змог падняць найбуйнейшае прадпрыемства краіны ў самыя цяжкія часы — на пачатку незалежнасці. Напэўна, яго з'яўленне ў Беларусі было невыпадковым. Прыехаўшы з Яраслаўскай вобласці Расіі, ён мог бы вярнуцца назад і працаваць зусім у іншым месцы, аднак лёс пакінуў яго ў Сінявокай. Герой Беларусі, доктар тэхнічных навук, дырэктар навукова-практычнага цэнтра «Кар'ерная тэхніка» дзяржаўнай навуковай установы «Аб'яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» Павел МАРЫЕЎ расказаў нашаму карэспандэнту некалькі фактаў з гісторыі Беларускага аўтамабільнага завода, краіны і свайго жыцця.

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ІНАВАЦЫІ ВЫРАТАВАЛІ

— Лёгка ніколі не было. Асабліва ў пачатку 1990-х. Сёння мы гаворым пра эканамічны крызіс. А тады гэта быў і эканамічны, і палітычны крызіс. Неабходна было ўспомніць, для чаго і каго мы робім сваю прадукцыю. Вядома, што для заказчыка. І мы пайшлі да яго. Больш уважліва высветлілі, чаго не хапае нашым машынам. У выніку мы перагледзелі і канструктарскія, і тэхналагічныя рашэнні. Выйшлі ўрэшце на праект рэканструкцыі. Менавіта тады быў створаны зачын для з'яўлення ў будучыні больш буйных машын. У нейкім сэнсе ўжо тады мы задумваліся пра 450-тоннік. Хаця максімальнымі тады былі 180-тонныя самазвалы. Самі лічбы не называліся, але ўсе разумелі, што будуць большыя машыны. Габарыты карпусоў будавалі з улікам таго, каб мог выехаць аўтамабіль грузападымальнасцю ў 300 тон. Гэта яркі прыклад, што дзякуючы інавацыям можна аднавіць свае пазіцыі і нават падняцца вышэй. А ўвогуле, захаванне калектыву стала маёй самай галоўнай задачай на пасадзе дырэктара завода.

ПАКУЛЬ НЕ ПРЫЦІСНЕ

— Давайце паглядзім, якія сёння праблемы ў прадпрыемстваў: практычна няма свежых ідэй. Доўгі час выкарыстоўвалася тое, што было назапашана ў папярэднія гады — і па канструкцыях, і па тэхналогіях. А гэта — вычарпальная крыніца, і сёння практычна няма пунктаў росту для развіцця. Калі мы не займемся інавацыямі, як бы ні было цяжка ў фінансавым плане, пераходам на новыя віды прадукцыі, то старое нас пацягне на дно. Дзейнасць большасці прадпрыемстваў накіравана на захаванне жыццяздольнасці ўвогуле, а не на ўкараненне інавацыйных распрацовак. Іх стратэгічныя планы развіцця не прадугледжваюць такіх падыходаў. На жаль, у нас больш жывучы прынцып «пакуль не прыцісне». Але ён бесперспектыўны, і без змен айчынная прамысловасць не зможа пераадолець адставанне ад сусветных вытворцаў. Відавочна, што толькі глабальныя задачы і толькі добра пралічаны бізнес-план, веданне сваёй рыначнай нішы, наяўнасць калектыву аднадумцаў-прафесіяналаў могуць забяспечыць поспех.

СЫН МАЗа

— Мой прыход на БелАЗ быў банальным. Я тады думаў толькі пра тое, як трапіць на аперацыю. Атрымаўшы траўму ў арміі, я паехаў у Інстытут артапедыі, які знаходзіўся ў Мінску. Але была вялікая чарга, і чакаць трэба было паўгода. Не хапала грошай вярнуцца ў Расію, а БелАЗ толькі пачынаў сваю працу. Першы раз на заводзе я апынуўся ў снежні 1958 года. У студзені 1959-га я ўжо прасіўся на працу, а з лютага стаў работнікам. Само прадпрыемства было толькі ў жніўні 1958-га арганізавана. Нарадзілася яно фактычна на базе цэха цяжкіх машын Мінскага аўтамабільнага завода. Чаму я выбраў менавіта гэты завод? Ува мне заўсёды была тэхнічная жылка, і мне падалося, што гэта насамрэч унікальная прадукцыя. Я быў упэўнены, што тут будзе заўсёды цікава. І чаканні юнацтва спраўдзіліся.

СПРЫЯЛЬНЫ ЧАС

— Першы самазвал меў грузападымальнасць 25 тон. У той час сярод астатніх аўтамабіляў ён здаваўся гігантам. Але гэта была не гігантаманія, а перыяд, калі ў СССР практычна паўсюль ішлі сур'ёзныя будоўлі — гідраэлектрастанцыі, металургічная вытворчасць, здабыча сыравіны. З'яўляліся кар'еры, а побач з кар'ерамі гарады. Таму прадукцыя завода адразу стала актуальнай.

ШМАТ ІНТЭЛЕКТУ

— Усё пачыналася з 700 чалавек. Аднак тыя задачы, якія стаялі перад прадпрыемствам, зразумела, патрабавалі большай колькасці работнікаў. І асабліва спецыялістаў. Калектыў фарміраваўся не толькі з беларусаў. Шмат прыехала іх з Расіі. Тут патрэбны былі розныя спецыяльнасці, і не заўсёды нашы ВНУ маглі іх падрыхтаваць. Таму ехалі сюды з Масквы, Казані і іншых гарадоў. Для стварэння такой тэхнікі патрабаваліся новыя думкі, новыя падыходы. І калектыў нараджаўся адразу здаровым. Жыццё пацвердзіла, што калі аб'ект створаны добрымі канструктарамі і адпавядае ўсім патрабаванням, якія ад яго чакаюць, то гэта поспех усяго прадпрыемства. Толькі ў такім выпадку можна атрымаць і добрыя эканамічныя вынікі. Сапраўды, у «БелАЗах» шмат інтэлекту.

ЗАВОД=ГОРАД

— Першае маё ўражанне ў Жодзіне — там не было ў той час ніводнага квадратнага метра асфальту. Развіццё завода і горада ішло па адным праекце. Вытворчасць нараджала горад. Таксама мне вельмі пашчасціла, што на заводзе сабраліся самыя высокакваліфікаваныя кадры, сярод якіх цяжка было не навучыцца таму, што яны ўмеюць. Гэты калектыў адразу быў дзеяздольным. Шмат было таленавітых людзей. Узорам для мяне стаў першы дырэктар — Мікалай Дзеравянка. Ён не заканчваў ніякіх інстытутаў, але меў выключныя арганізатарскія здольнасці. Яго мабільнасць дазваляла займацца і прадпрыемствам, і будаўніцтвам горада.

РЭСУРСЫ ПАДАРАЖЭЛІ

— Вялікія запасы на складах — гэта ненармальна. І звязана гэта з абвастрэннем становішча ў свеце. Няма спакою. Гэта прывяло да звужэння рынкаў, росту недаверу. Але доўга так не будзе цягнуцца. Галоўны рынак для нашых самазвалаў — гэта, безумоўна, Расія. Бо там здабываецца больш за ўсё сыравіны. І дадатковыя рынкі, якія мае БелАЗ, займаюць нязначную долю. Не таму, што якасць машын горшая, а таму, што там патрэба меншая. А рэсурсы скарачаюцца. Іх стала больш дорага здабываць, таму патрэбны машыны з меншым коштам і большай функцыянальнасцю.

ПРА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

— Як кажа наш Прэзідэнт, незалежнасць — гэта не проста лозунгі, а магчымасць нечага дасягнуць. І мы сваёю незалежнасцю скарысталіся вельмі рацыянальна. Бо былі вызначаны правільныя прыярытэты развіцця: харчаванне, экспарт, жыллё, інвестыцыі і інавацыі. І гэта дазволіла аб'яўлены суверэнітэт пацвердзіць справамі.

ПРА ЗВАННЕ ГЕРОЯ

— Для мяне ўзнагарода стала нечаканасцю. Якраз у поўным разгары быў праект рэканструкцыі, паступіла новае абсталяванне, мы падрамантавалі цэхі. Стварылі некалькі новых мадэляў. І раптам — наведванне завода Прэзідэнтам. Ведаеце, мы ж усю мадэрнізацыю рабілі без прыцягнення сродкаў дзяржавы. Узялі замежны крэдыт. Дзяржава дапамагла гарантыямі вяртання. Такое было ўпершыню. І мы змаглі даказаць перад заходнім банкам, што разлічымся. Потым гэта стала прыкладам для іншых прадпрыемстваў. Прэзідэнту ўсё спадабалася, і ён вельмі хутка прыняў рашэнне аб маім узнагароджанні. Яго, відаць, уразіла тое, што ў той час, калі ўсе патрабуюць ад дзяржавы дапамогі, на нашым заводзе ў яго нічога не просяць. Гэта быў адзін з першых вопытаў гаспадарання ў рынкавых умовах.

УСЁ РОЎНА ШТО НА ЛЕГКАВІКУ

— Я кіраваў «БелАЗамі». Аднак толькі на палігоне. На жаль, за руль 450-тонніка я не садзіўся. У мяне ёсць правы на кіраванне легкавым аўто, і ў фізічным плане ніякай розніцы нама — што легкавік, што самазвал. Усе нарматывы высілкаў адносна павароту руля, націскання педаляў выкананы па стандарце аўтамабіля. Адзіная незвычайнасць — у габарытах. Іх трэба адчуваць праз люстэркі.

Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.
kuletski@zviazda.by

■ Будні прафесіяналаў

МАЙСТРЫ НА КОЛАХ

Вадзіцелі аўтобусаў «Мінсктранса» паспаборнічалі за званне найлепшага

Конкурс прафесійнага майстэрства «Мінскі майстар», які ўпершыню быў праведзены ў 2004 годзе сярод усіх рабочых спецыяльнасцяў, стаў неад'емнай часткай сталічнага жыцця.

Каб заваяваць званне найлепшага вадзіцеля аўтобуса, канкурсантам прыйшлося сур'ёзна пастарацца. Змейка, паркоўка заднім ходам, бокс, прыпыначны пункт — гэта далёка не поўны спіс элементаў, якія неабходна было выканаць на паласе, і ўсё гэта — на хуткасць! Конкурс праходзіў на тэрыторыі аўтобуснага парка №6 на аўтобусах «МАЗ-103» (кароткі) і «МАЗ-105» («гармонік»). Дарэчы, маршрут да апошняга моманту трымаўся арганізатарамі ў сакрэце.

І вось у прызначаны час пачынаецца першы этап — праверка ведаў ПДР, а таксама кантроль на алкаголь. Кіроўцы садзяцца за руль. Ніколі не думаў, што аўтобус здольны выконваць такія «фігуры пілатажу», але, верагодна, вадзіцелі дазволілі сабе тое, чаго ніколі не зрабілі б на працоўным маршруце: заносы, «дрыфт» і высокую хуткасць.

Сёлета, дарэчы, у конкурсе ўпершыню прымалі ўдзел жанчыны. Акрамя таго, былі запрошаны ўдзельнікі з Масквы і Санкт-Пецярбурга.

Кіроўца аўтобуснага парка №5 Яўген КОВЕЛЬ ужо шэсць гадоў удзельнічае ў гэтым конкурсе і заваяваў нямала прызоў, у тым ліку і званне «Мінскі майстар-2013», але спрынт на «МАЗ-105» выйграў упершыню. «Першы раз удзельнічаў ў конкурсе: вырашыў проста паспрабаваць свае сілы, і ў мяне нядрэнна атрымалася, а потым уцягнуўся», — кажа мужчына. Працуе кіроўца на новым аўтобусе на маршруце №1.

Дзяўчат-вадзіцеляў у спаборніцтве ўдзельнічала не так шмат, аднак канкурэнцыя была не меншая, чым у мужчын. **Вольга МАРЧУК з аўтобуснага парка №7** перамагла сярод жанчын: «Сама вырашыла паспрабаваць свае сілы ў гэтым спаборніцтве, і ўсё вельмі спадабалася. Цяпер хачу выступіць і ў наступным годзе, ёсць да чаго імкнуцца ў прафесійным плане».

Варта адзначыць, што пераможцы атрымалі не толькі дыпломы і медалі, але і нядрэнныя грашовыя ўзнагароды. Арганізатары паклапаціліся, каб ніхто з удзельнікаў не застаўся без падарунка.

Сяргей НІКАНОВІЧ.
Фота аўтара

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

23 ЛІПЕНЯ 2015 г.
ЧАЦВЕР
№ 14 (15773)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Імёны

Milki:

«Трэба верыць у свае сілы!»

Група, у якой сёння спяваюць пяць чароўных дзяўчат — Марына Путнікава, Таццяна Стахоўская, Таісія Серыкава, Ганна Рай і Вікторыя Назарко, — была створана крыху больш як паўгода таму. Аляксандр Рыбак адбіраў удзельніц для гурта падчас кастынгаў па розных гарадах Беларусі. Так з'явіўся калектыў Milki. Першая спроба пакарыць «Еўрафэст» дзяўчатам не ўдалася. Але яны паставіліся да сваёй няўдачы спакойна: кажуць, значыць, будзем пакараць іншыя вяршыні. Мы сустрэліся з удзельнікамі гурта перад іх выступленнем у Віцебску, каб пазнаёміцца бліжэй.

— У вас ёсць міжнародны фан-сайт. Ці адсочваеце, якія водгукі пакідаюць прыхільнікі?

Таццяна: Пішуць рознае, але каментарыі і паведамленні пераважна станоўчыя. Нам прыемна, што людзі так нас прымаюць, нягледзячы на малады ўзрост калектыву. Няхай мы сфарміраваліся толькі перад «Еўрафэстам», але народ палюбіў нас за тое, што мы рабілі. І, нават калі мы не прайшлі, публіка не перастала нас падтрымліваць — значыць, ёсць да чаго імкнуцца і трэба рухацца наперад.

Пасля адбору на «Еўрафэсце» ў дзяўчат быў творчы адпачынак. Але калектыў працягвае сваё сцэнічнае жыццё. Зараз дзяўчаты актыўна ездзяць на сумесныя канцэрты з Ларысай Грыбалёвай і Сашам Нэма. У найбліжэйшай перспектыве — запіс кліпа на любімую ўжо многімі песню «Акцэнт».

Дарэчы, дзяўчаты не толькі спяваюць у гурце, але і рэалізуюць сябе ў розных іншых сферах. Марына працуе выкладчыцай харавой дысцыпліны ў сваім горадзе, Таісія выкладае вакал дарослым, Ганна працягвае вучобу ва Універсітэце культуры, а Таццяна гастраліруе з заслужаным ансамблем Беларусі «Церніца», маючы магчымасць і спяваць, і вандраваць.

(Заканчэнне на 8-й стар. «ЧЗ».)

Галопам да перамог

БЫЦЬ У СЯДЛЕ!

Коні вучаць гэтаму не толькі ў спорце

Навошта дзеці носяць з сабой у лагер цукар, пра што лепш не ведаць іх бацькам і як навучыцца кіраваць пяццю цэнтнерамі жывой вагі, высвятлялі карэспандэнты «Чырвонкі», якія наведалі спартыўна-аздараўленчы лагер дзённага знаходжання для навучэнцаў Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі коннага спорту і конегадоўлі.

ХАРЫЗМА ВЫХАВАНКІ ДАШЫ

— Не бойцеся вы яго так, — паказваючы на каня, звяртаецца да мяне выхаванка цэнтра Даша Бронская. — Гэта Харызма. Яна вельмі любіць цукар і яблыкі. Вось, — працягвае Даша пачастункі, — пакарміце свайго новага сябра.

Сябрамі, як мне падалося, з Харызмай мы так і не сталі. Кабыла з маёй рукі ўсё, вядома, з'ела, але пасля зноў павярнулася да Дашы.

— Харызма адчувае, што вы яе трохі баіцеся, — быццам апраўдваецца дзяўчына. — Я ўвогуле да гэтага каня тры месяцы падыход шукала. Тут не ўсё так проста. Спачатку жывёла да цябе прывыкае, потым правярае і толькі пасля дазваляе вершніку стаць у «дуэце» галоўным.

Юная спартсменка прызнаецца, што не заўсёды расказвае пра падобныя «прыгоды», калі конь шкоднічае, бацькам.

(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)

Даша Бронская і Харызма спяшаюцца на ранішнюю трэніроўку.

Фота Надзеі БУЖАН.

«Горадаўтваральная» адукацыя

ПА РАБОЧУЮ ПРАФЕСІЮ — У... ГІМНАЗІЮ

Маладыя шведы лічаць, што вучыцца ніколі не позна

Атрымаць музычную адукацыю, вывучыцца на зваршчыка і фрэзероўшчыка, засвоіць прафесію цырульніка ці кухара шведскія старшакласнікі могуць у сценах адной навучальнай установы. Як гэта адбываецца, беларускія педагогі і журналісты змаглі ўбачыць на свае вочы, наведаўшы гімназію ў горадзе Оскарсхамн. Гімназічная адукацыя ў Швецыі — гэта старшая ступень школы. Яе праграма разлічана на тры гады. Дарэчы, гімназію ў Швецыі заканчваюць, па нашых мерках, даволі позна — у 18-19 гадоў. А вучняў гімназіі тут называюць... студэнтамі. Абавязковая адукацыя ў гэтай краіне — дзевяцігадовая, але ўсе разумеюць, што ў сучасным свеце як мінімум без сярэдняй адукацыі не абысціся, таму каля 95% падлеткаў не спыняюцца на дзевяці класах і ў залежнасці ад сваіх інтарэсаў і схільнасцяў выбіраюць для сябе ў гімназіі тую ці іншую праграму навучання. А выбіраць ёсць з чаго.

Крысціна Ліндваль і Ёран Андэрсан: «У Швецыі вельмі ганарацца сваёй музычнай адукацыяй...».

КАДРЫ ДЛЯ СВАЙГО РЭГІЁНА

Гімназія горада Оскарсхамн сярэдняя па памерах. Яе наведваюць прыблізна 1 100 чалавек. Тут ёсць аддзяленне, дзе эмігранты могуць вывучаць шведскую мову. Ёсць спецыяльнае аддзяленне для дзяцей з асаблівасцямі разумовага развіцця. Тут жа могуць падцягнуць свае веды па тых ці іншых прадметах і дарослыя, якія ўжо выйшлі з гімназічнага ўзросту.

— Паколькі гімназія ў горадзе ўсяго адна, мы імкнёмся максімальна задаволіць усе адукацыйныя запыты, — расказвае яе дырэктар Ніклас Хамар. — Дарэчы, па колькасці супрацоўнікаў наша навучальная ўстанова — у пэўным сэнсе даволі буйное прадпрыемства ў горадзе.

У Швецыі няма аналагаў беларускай сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Затое яшчэ на старшай ступені школы ёсць магчымасць бліжэй пазнаёміцца, а магчыма, і звязаць свой далейшы лёс з той ці іншай прафесіяй. Оскарсхамн — партова-прамысловы горад. Непадалёку ад яго знаходзіцца атамная электрастанцыя. Таму педагогі лічаць сваёй задачай вырасціць новае пакаленне рабочых для транспартнай галіны, будаўніцтва і прамысловасці.

Кіраўнік прамысловай праграмы Хелена ГРЭН падкрэслівае, што ў аснову яе заняткаў пакладзена рэалізацыя тых ці іншых канкрэтных праектаў, паколькі вельмі важна, каб вучні выраблялі рэчы, якія насамрэч будуць кімсьці запатрабаваныя.

(Заканчэнне на 5-й стар. «ЧЗ».)

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 07 2015 г.

І так бывае

«МАГІСТРАЛЬНЫ» ВЫБАР ДЗЯЎЧЫНЫ

Мужчынская справа не перашкаджае заставацца ёй жаноцкай

...Памятаю, як упершыню ўбачыла Вольгу. Невысокага росту, танюткая, прыгожая, на абцасах і ў элегантнай сукенцы. І галоўнае — са шчырай, светлай усмешкай. Мы разгаварыліся. Слова за слова, і раптам высвятляецца, што гэтай мілай дзяўчыне на працы даводзіцца круціць балты і рамантаваць чыгуначныя пуці...
Я прыехала на чыгуначную станцыю «Сцяпянка», дзе ўжо не ў вячэрнім строі, а ў працоўным адзенні, так званай «робе», мяне сустрэла ўсё тая ж усмешлівая Вольга Рыпінская. І расказала, як гэта — быць электрамеханікам.

— Ты добра пішаш вершы і прозу, малюеш. І я задаюся пытаннем: чаму менавіта гэтая прафесія?

— У школе асабліва любіла матэматыку, фізіку, хоць спраўлялася з усімі прадметамі і магла выбраць любую спецыяльнасць. Але ж мы з аднакласнікам з дзяцінства марылі стаць праваднікамі. Калі прыехалі паступаць у Брэсцкі дзяржаўны каледж чыгуначнага транспарту пасля 11 класа, то месцаў на гэтую спецыяльнасць ужо не было. І тады хтосьці падказаў, што з нашымі баламі атэстаты можна пайсці і «вышэй». Я выбрала электрамеханіку — акурат па балах атрымлівалася. У прыёмнай камісіі мяне папярэдзілі, што я магу аказацца адзінай дзяўчынай у групе. Гэта, вядома, мяне не спужала *(усміхаецца)*. Аказалася, нас такіх бясстрашных было шасцёра з 25 чалавек.

Вучыцца было вельмі складана. Напэўна, таму працаваць цяпер лёгка. Тады трэба было пастаянна чарціць і запамінаць шмат схем. Часам пераносілі іх з падручнікаў на рулон міліметроўкі ў 25 метраў. Было няпроста, але ў мяне добра атрымлівалася. Нават хлопцам дапамагала. Поўны халадзільнік шакаладак заўжды мела *(смяецца)*. Зразумела ж, у нас была і слясарная практыка, і мантажная, а таксама вучыліся паяць.

— У чым цяпер заключаецца твая праца?

— Асноўная задача электрамеханіка — работа са схемамі. Разабрацца, што ў іх не працуе. А манцёры ўжо павінны выпраўляць усё на месцы: круціць балты, напрыклад. Работнікаў у нас часам не хапае, таму часта даводзіцца рабіць усё самой.

— Ці ёсць у калектыве яшчэ дзяўчаты?

— Сярод электрамеханікаў і манцёраў на ўчастку ад Мінска-Пасажырскага да Барысава — адна я. Але ўвогуле на дыстанцыях у іншых аддзяленнях, напрыклад касірамі, жанчын працуе даволі шмат. Сярод мужчын мне падабаецца. У жаночым калектыве ўсе заўжды ўсіх абмяркоўваюць. Хто як апрануўся, як дома справы, як іншыя людзі сябе паводзяць. А з мужчынамі ўсё значна прасцей. З імі таксама можна пагаварыць пра ўсё — ад машын да нейкіх асабістых пытанняў — але яны не асудзяць і падтрымаюць. Што датычыцца іх стаўлення да мяне, то я раблю працу так, як і мужчыны. Яны гэта бачаць, цэняць і дапамагаюць, калі раптам што ў мяне не атрымліваецца. Адгукаюцца заўжды. Хоць ставяцца да мяне ўсё адно паважліва і клапатліва.

— А як наконт моцных слоўцаў?

— У маёй прысутнасці ўсе стараюцца іх не выкарыстоўваць. І я таксама. Але ж бываюць розныя сітуацыі. Напрыклад, прашу пуцевікоў штосьці зрабіць. Ласкава, часам з жартам. Яны не выконваюць, і на наступны дзень я зноў ім нагадваю. Сітуацыя паўтараецца. А на трэці ўжо прыходзіцца падыходзіць і тлумачыць больш жорстка. Але я стараюся, па магчымасці, пазбягаць гэтага.

…Дзяўчына-электрамеханік, натуральна, не вельмі тыповая з'ява. Вольга кажа, што часта, калі міма «Сцяпянкі» праязджаюць чыгуначнікі з іншых станцый, то, убачыўшы яе, усміхаюцца. Прыязна і па-добраму.

Вераніка ПУСТАВІТ.
Фота аўтара.
pustavit@zviazda.by

Размеркаванне

ЯК «ПАДАЩЬ» ПЧАЛУ, або Пра свежае паветра, уражанні і адкрыцці

Некалі мы з аднакурснікамі на журфаку жартавалі, што выбралі няправільную спецыяльнасць — трэба было вучыцца на пчаляроў: працуеш сабе на прыродзе, зарабляеш грошы, а дома заўсёды пад рукой універсальны медыкамент і ласунак. Жарты жартамі, але сапраўды цікава, што сабой уяўляе гэта прафесія. У Беларусі спецыялістаў у сферы пчалярства рыхтуюць у Смілавіцкім дзяржаўным аграрным каледжы. Мы сустрэліся з двума выпускнікамі ўстановы, якія працуюць па размеркаванні на пчальніках агракамбіната «Ждановічы», і даведаліся, што прымусіла іх выбраць такі незвычайны занятак.

Развядзеннем пчол агракамбінат «Ждановічы» заняўся некалькі гадоў таму. За гэты час першапачатковыя трыццаць пчаліных сем'яў ператварыліся ў трыста, а таму ўтрымліваць усе іх на адной тэрыторыі няма сэнсу — не пракормяцца. Кожны пчаляр забірае вуллі туды, дзе жыве сам, і пчолы падарожнічаюць па ўсёй Беларусі. Сем'і, за якія адказваюць **маладыя спецыялісты Максім КУЛАГІН і Андрэй ПЕТРАКОВІЧ,** цяпер знаходзяцца непадалёк ад Мінска, каля вёскі Яркава. Тут размяшчаецца сад агракамбіната, а пчол выкарыстоўваюць у ролі «сезонных рабочых» — яны апыляюць пладовыя культуры. Праўда, мёд адсюль не збіраюць, бо дрэвы апрацаваны інсектыцыдамі.

У цэнтры імправізаванага пчальніка — вагончык, акружаны з усіх бакоў вуллямі. Тут і праводзяць хлопцы свой працоўны дзень. Наўкол — атрыбуты пчалярскай працы: медагонка, дымар, прычэп з брускамі, з якіх збіраюць рамкі для пчол, маскі...

22-гадовы Андрэй Петраковіч родам з Барысаўскага раёна, з двух гадоў рос у інтэрнаце. У школе ён вучыўся нядрэнна, і настаўнікі раілі яму атрымліваць сярэднюю спецыяльную адукацыю. Андрэй спыніў свой выбар на Мар'інагорскім аграрна-тэхнічным каледжы, на спецыяльнасці «тэхнік-механік». Але прафесія не прыйшлася яму па душы: не хапала ўседлівасці і цікавасці. Таму праз год хлопец забраў свае дакументы. Якраз у гэты час яго брат, які вучыўся ў Смілавічах на заатэхніка, расказаў, што ў мясцовы каледж набіраюць навучэнцаў на спецыяльнасць «пчалярства».

— Я тады засмяяўся, кажу: «Якое пчалярства, я ж пра пчол нічога не ведаю?» — узгадвае Андрэй. — Але потым вырашыў, што гэта не горшы варыянт — і каледж добры, і спецыяльнасць незвычайная.

Вучыцца, па словах Андрэя, было няцяжка. Агульнаадукацыйныя дысцыпліны даваліся яму лёгка, а профільныя прадметы былі цікавымі. У Смілавічах існаваў свой пчальнік на 70 сем'яў, дзе недасведчаныя ў пчалярстве навучэнцы спазнавалі азы прафесіі.

З васьмі гадзін раніцы да дзесяці вечара маладыя пчаляры знаходзяцца на пчальніку: сочаць за станам прыкладна ста сем'яў, іх актыўнасцю, здароўем, займаюцца выганкай мёду.

Зусім іншая гісторыя ў Максіма Кулагіна, якому цяпер 21 год. Хлопец родам з Міёрскага раёна, гадоў пяць таму, яшчэ калі быў школьнікам, летам пайшоў падпрацоўваць памочнікам пчаляра. Яшчэ раней яго бацька таксама меў невялікі пчальнік, таму, як клапаціцца пра пчол, Максім меў уяўленне.

Калі некаму здаецца, што пчалярства — нескладаная навука, то ён памыляецца: хлопцы катэгарычна абвяргаюць такую думку. Сярод профільных прадметаў — аграномія, батаніка, кармавая база і біялогія меданоснай пчалы, хваробы і шкоднікі, тэхнічнае забеспячэнне пчалярства... Іх рамяство знаходзіцца на перасячэнні многіх прыродазнаўчых і тэхнічных навук, і ведаць трэба шмат.

Год таму Андрэй і Максім скончылі навучанне і падаліся на першае месца працы. Андрэй, хоць мог і не размяркоўвацца, усё ж-такі вырашыў скарыстацца гэтым шанцам. Тым больш што хлопцам прапанавалі нядрэнны варыянт — агракамбінат «Ждановічы» адразу забяспечваў маладых супрацоўнікаў жыллём і неблагім заробкам. Абодвух спецыялістаў узялі на пасаду пчаляроў: Максім кіруе звяном, Андрэй — яго адзіны падначалены.

Найбольш напружаны час для хлопцаў — лета. У пчол пачынаецца перыяд актыўнага медазбору, а таму пчалярам трэба заўсёды быць побач. Прыходзіцца падладжвацца пад рытм насякомых, чыё імя стала сінонімам працавітасці. З васьмі гадзін раніцы да дзесяці вечара маладыя пчаляры знаходзяцца на пчальніку: сочаць за станам прыкладна ста сем'яў, іх актыўнасцю, здароўем, займаюцца выганкай мёду.

— Я люблю пагуляць, адпачыць, схадзіць у кіно ці кавярню, — смяецца Андрэй, — і таму сябры перастаюць мяне разумець. Тэлефануюць круглыя суткі: «Ты дзе?» Я кажу: «На працы». «Дык што гэта ў цябе за праца такая, што ты там і дзень, і ноч, і у будні, і ў выхадныя?!»

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Андрэй Петраковіч *(злева)* і Максім Кулагін правяраюць шматтысячную гаспадарку.

Нярэдка пчол даводзіцца перавозіць у іншае месца — калі адцвітае адзін меданос і пачынае цвісці іншы. Для такіх мэт хлопцам выдзелілі службовую «Ніву». Падчас аднаго з пераездаў здарыўся, можна сказаць, экстрэмальны выпадак — у накрыўцы аднаго з вулляў была дзірка, і раззлаваныя грукатам і вібрацыяй пчолы накінуліся на сваіх «апекуноў». Хлопцы са смехам распавядаюць, як яны ўцякалі ад раз'юшанай «хмары», кінуўшы машыну і ўсё, што ў ёй было. Увогуле, пастаянныя ўджаленні — спецыфіка працы, на якую пчаляры не скардзяцца. Кажуць жа, што апітэрапія станоўча ўплывае на здароўе. Андрэй дэманструе «працоўную траўму» — адразу пяць свежых укусаў каля ахілавага сухажылля. Пчолы чуюць пах яду і стараюцца джаліць у адно і тое ж месца.

Узімку працы, зразумела, менш. Пераважна, падрыхтоўка да сезона: рамонт вулляў, нарыхтоўка рамак. Заробак — ад пяці да шасці мільёнаў рублёў. Па пчалярскіх мерках, гэта нямала.

— На працу я не скарджуся, — дзеліцца Максім, — толькі што адпачываць летам няма калі. Гэта галоўны мінус. Плюсаў шмат — свежае паветра, заўсёды новыя ўражанні, новыя адкрыцці. Ад такой працы менш стамляешся. Але ўвогуле цяжка гэта патлумачыць — люблю і ўсё.

А ці любяць маладыя пчаляры галоўны прадукт сваёй працы — мёд? Абодва ўсміхаюцца — не вельмі.

Максім плануе і надалей працаваць у пчалярстве. Андрэй жа з будучыняй пакуль не вызначыўся — ён кажа, што не любіць загадваць. Яшчэ чатыры гады таму ён смяяўся з брата, які прапаноўваў яму вучыцца на пчаляра, а цяпер вось ужо год як працуе на пчальніку, таму заракацца, на яго думку, нельга.

...У Смілавіцкім каледжы набор на спецыяльнасць «пчаляр» сёлета не праводзіцца і наўрад ці будзе — няма попыту на такіх спецыялістаў. У нас дагэтуль няма адзінай арганізацыі, якая б займалася праблемамі гэтай сферы і прадстаўляла інтарэсы беларускіх пчаляроў і гаспадарак. Хлопцы кажуць, што прыкладам тут можа быць суседняя Польшча — у гэтай краіне зроблена ўсё, каб рамяство развівалася: укараняюцца новыя тэхналогіі, гаспадаркі крэдытуюцца. У нас жа ўсё трымаецца на ўласнай ініцыятыве кіраўнікоў прадпрыемстваў, як, напрыклад, у агракамбінаце «Ждановічы».

Але, на думку Андрэя і Максіма, пчалярства абавязкова павінна быць прафесіяй, а не хобі.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ. *lyskavets@zviazda.by*

З гумарам аб сур'ёзным

ПРА АГРАТУРЫЗМ РАСКАЖА... «СЕЛЯДЗЕЦ»

Здзівіць каго-небудзь студэнцкім часопісам у нашы часы цяжка. Але «Селядзец», які выпускаюць студэнты факультэта міжнародных адносін БДУ, уражвае — акрамя незвычайнай назвы, у яго не зусім звыклы змест: выданне прысвечана айчыннаму агратурызму, а самі матэрыялы напісаны з гумарам. Мы сустрэліся з галоўным рэдактарам выдання трэцякурснікам ФМА Цімурам ХОДЗІНЫМ, і распыталі яго пра журналісцкі досвед і погляды моладзі на развіццё айчыннага турызму.

— Цімур, як так сталася, што студэнты факультэта міжнародных адносін пачалі выпускаць часопіс, ды яшчэ і пра агратурызм?

— Нічога дзіўнага тут няма — я студэнт спецыяльнасці «Менеджмент сферы турызму». Пасля трэцяга курса ўсе выбіраюць адзін з трох кірункаў, па якім яны будуць вучыцца далей: «Уязны і выязны турызм», «Сфера гасціннасці» або «Агратурызм». Сёлета, праўда, студэнтаў на апошні не набралася, але на базе Беларускага грамадскага аб'яднання «Адпачынак у вёсцы» быў створаны філіял кафедры міжнароднага турызму ФМА. Ініцыятарам была наша выкладчыца Валерыя Кліцунова, якая ўжо даўно папулярызуе ў Беларусі агратурызм. Уключыць выданне тэматычнага часопіса ў навучальную праграму філіяла таксама было яе ідэяй, таму можна сказаць, што гэта быў загад «зверху». Мяне прызначылі галоўным рэдактарам і паставілі перад фактам — трэба зрабіць цікавае выданне.

— І як было без практыкі тое рабіць?

— Першы нумар трэба было выпусціць вельмі хутка, літаральна за тыдзень. І гэта пры тым, што ў нас ужо пачалася заліковая сесія, трэба было тэрмінова закрываць усе «хвасты» і адначасова займацца часопісам. Усё рабілася ў такім рытме, што звярстаны канчатковы варыянт «Селядца» я ўпершыню ўзяў у рукі толькі за пяць хвілін да яго прэзентацыі.

З пошукам аўтараў праблем не было, у нас на факультэце ёсць свае газеты і часопісы, напрыклад, «ФМОn-line». Акрамя таго, заўсёды можна ўзгадаць, хто са знаёмых студэнтаў цікавіцца гэтай тэмай. Галоўнай складанасцю для нас былі тэхнічныя пытанні, у першую чаргу — вёрстка. На ФМА гэтаму не вучаць, таму нам дапамагаў хлопец з Інстытута журналістыкі БДУ. Дарэчы, большасць аўтараў з уласнай ініцыятывы напісалі свае матэрыялы па-беларуску.

Увогуле, мы імкнуліся не замыкацца на тэме агратурызму (ды і зусім стараліся не ўжываць гэтага слова), а рабіць часопіс, які быў бы цікавы любому маладому чытачу. Гэта было галоўнай задачай.

— А назва?..

— «Селядзец» расшыфроўваецца як «сельскі дзённік». Дарэчы, на прэзентацыі нас пакрытыкавалі за тое, што назва занадта адцягнутая ад тэматыкі. Але пазней я адшукаў для яе гістарычную падставу: у Вялікім Княстве Літоўскім селядзец быў нярэдкім «госцем» на сталах шляхціцаў.

— Якія з артыкулаў першага нумара ты б адзначыў найперш?

— Вось, напрыклад, на вокладку вынесены матэрыял пад загалоўкам «Шок! Што беларускі агратурызм робіць з людзьмі? Аповед ахвяры» пяцікурсніка Мікалая Ханіна, у якім ён проста жартаўліва распавядае пра сваё знаёмства з сельскім турызмам. Пяцікурсніца Марыя Відзевіч паўдзельнічала ў славутай «Жаніцьбе Цярэшкі» ў адной з аграсядзіб, напісала рэпартаж. Яшчэ адна пяцікурсніца, Юлія Ласіцкая, наведала аграсядзібу, у якой людзей лечаць пры дапамозе пчол, толькі не звыклым джаленнем, а адпачынкам на спецыяльным ложку, пад якім знаходзяцца вуллі. Я з'ездзіў у вандроўку ў Глыбокае і Паставы, таксама напісаў рэпартаж. А другакурсніца Алена Бекус правяла апытанку пра адпачынак у вёсцы.

— Як распаўсюджваецца «Селядзец»? Папяровымі асобнікамі ці праз інтэрнэт?

— Электронная версія размешчана на сайце ФМА, там кожны можа яе спампаваць. Яшчэ, наколькі я ведаю, БГА «Адпачынак у вёсцы» рассылае яго гаспадарам аграсядзіб. Ну і я сваім сябрам адпраўляў, куды ж без гэтага? Наступны нумар павінен выйсці ў верасні, і ў нас ужо ёсць шмат ідэй, як пашырыць аўдыторыю ці хаця б зрабіць часопіс больш цікавым.

— Какой будучыню беларускага турызму бачаць самі студэнты? У прыватнасці, твае погляды на развіццё гэтай сферы?

— Асабіста я лічу, што ў Беларусі неверагодна вялікі турыстычны патэнцыял. Але беларусы часам не звяртаюць увагі на тую спадчыну, якая ў нас засталася. Узяць, напрыклад, Мінск: гістарычная забудова на вуліцах Карла Маркса, Рэвалюцыйнай, Кастрычніцкай, іншых можа быць цікавая турыстам з Заходняй Еўропы. Нашы замкі і палацы здзіўляць расіян. А тым, хто любіць адпачываць на прыродзе, варта ўзгадаць пра аграсядзібы. Іншая справа, як усё гэта рэалізавана. Калі, напрыклад, музеі не працуюць на святы... Неаднойчы ў невялікіх гарадах прыходзіў ва ўстановы, дзе не было экскурсавода. Для экскурсіі ім трэба загадзя тэлефанаваць! Пасля такога знікае жаданне нешта рабіць. Не трэба цурацца свайго мінулага, тым больш што ў нас ёсць чым ганарыцца.

Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.
lyskavets@zviazda.by

Гульні розуму

Квэст як «машына часу»

У моладзі папулярная новая забава

Інтэлектуальныя гульні заўсёды знаходзяць сваіх прыхільнікаў. Могуць змяняцца іх форма і ўзровень складанасці, але сутнасць заўсёды адна: перамагаць сілай думкі. Як высвятляецца, для актыўнай моладзі ўжо не цікава проста аналізаваць і разважаць. Душа патрабуе дзеяння! Таму наўздагон звыклым гульням сталі з'яўляцца так званыя «квэсты ў рэчаіснасці».

Сёння ў Беларусі попыт на іх такі вялікі, што адкрываюцца ўсё новыя квэст-пляцоўкі. Пад апошнія арандуюць старыя прамысловыя памяшканні, падвалы і нават офісы. Унутры кожная з пляцовак перароблена такім чынам, каб гульцы адчувалі атмасферу месца, куды іх «пераносіць» сюжэт. Пра тонкасці стварэння паралельнай рэчаіснасці ў звычайным памяшканні, а таксама пра тое, чаму людзі розных узростаў з задавальненнем бавяць вольны час за такімі гульнямі, расказала адміністратар адной з квэст-пляцовак Настасся Конева:

— Сюжэтныя гульні неверагодна захапляльныя. Уявіце, што вы можаце апынуцца дзе заўгодна і адчуць сябе на месцы іншага чалавека ў іншым жыцці. Прычым сюжэт можна выбраць самому. Адправіцца, напрыклад, у Манака рабаваць банкі. Ці апынуцца ў беларускім лесе ўлетку 1944 года. Між іншым, вось гэты квэст, які так і называецца — «Лета 44-га», — самы запатрабаваны сярод нашых гасцей усіх узростаў. Гэта і не дзіўна, бо ў нас з асаблівай пашанай ставяцца да ваеннага мінулага. Як развіваецца сюжэт? Уявіце, што вас разам з таварышамі схапілі ў палон немцы і зачынілі ў хляве. Каб пазбегнуць расправы, якая немінуча чакае ранкам, трэба выбрацца з будынка, абязброіць ворага і прабрацца ў штаб да партызанаў. Пасля адчыніць сакрэтны бункер і абясшкодзіць яго. І ўсё гэта трэба паспець зрабіць, уклаўшыся ў адведзены час.

Па словах дзяўчыны, каб гуляць, не трэба мець нейкай асаблівай фізічнай падрыхтоўкі, не абавязкова быць кандыдатам навук. На шляху да перамогі некалькі галаваломак рашыць прыйдзецца, але нічога звышцяжкага там няма. Галоўнае, што вам трэба, — гэта ўважлівасць, гатоўнасць працаваць у камандзе і настрой на прыгоды. Тым больш што за гульнёй увесь час назіраюць адміністратары. Вы можаце быць упэўнены ў тым, што знаходзіцеся ў бяспецы, а ў хвіліну адчаю атрымаеце падказку (іх у арсенале адміністратараў бясконцае мноства).

— Усе гульні праводзяцца ў закрытых памяшканнях, але абсталяванне праўдападобнае настолькі, што адчуваюцца нават пахі. Над стварэннем адпаведнай атмасферы мы працуем з асаблівай увагай. Большая частка рэквізіту збіралася па ўсім свеце. Асабліва часта цікавыя рэчы выстаўляюць на продаж у Англіі і Злучаных Штатах. Шукаем такі «тавар» на блышыных рынках, барахолках, на розных сайтах і сярод знаёмых. Цікавыя дробязі лепш за што іншае дапамагаюць спраўляцца з галоўнай задачай пераўвасаблення — перанесці гульца ў іншую рэальнасць, — працягвае ўводзіць у курс справы Настасся. — Удзельнічае ў квэсце абавязкова каманда з двух—дзевяці чалавек. Да нас прыходзяць і проста сябры, ладзяцца і карпаратывы. Нават бывае такое, што знаёмяцца невялічкімі камандамі на месцы, аб'ядноўваюцца і складаюць адну вялікую. Псіхалагічна вельмі карысна будаваць гульню такім чынам. Атрымліваецца, што ты гуляеш не супраць другой каманды ці кагосьці асабіста, а наадварот — робіш усё магчымае ў інтарэсах сваёй.

Квэсты папулярныя таму, што сёння модна быць разумным і кемлівым і ўмець гэтым карыстацца. Ды і людзі з сучасным рытмам жыцця цэняць свой вольны час і грунтоўна падыходзяць да выбару якаснага адпачынку. Квэст дае магчымасць на гадзіну вырвацца з прывычнага кола. Дзякуючы цікавым сюжэтам і арыентаванасці на камандную гульню мяняецца эмацыянальны фон чалавека. Бывае і такое, што ў працэсе гульні здзяйсняюцца дзіцячыя мары накшталт выратавання чалавецтва ці хаця б сваёй каманды. У любым выпадку, нават самы прымітыўны квэст куды цікавейшы, чым звычайны пятнічны вечар, праведзены на канапе або ў сеціве.

...На выхадзе з квэст-пляцоўкі я дачакалася студэнтку БДТУ Кацярыну Стэфановіч і супрацоўніка праваахоўных органаў Яраслава Бярозку, якія толькі што скончылі гульню, і папрасіла падзяліцца ўражаннямі.

Кацярына: — Засталіся вельмі задаволеныя. Галаваломкі былі цікавыя, хоць і не надта цяжкія. Але адчуванне, што вось-вось скончыцца наш час, прымушае сэрца біцца хутчэй.

Яраслаў: — За гульню на дваіх мы аддалі 500 тысяч рублёў, але іх не шкада. Я і не заўважыў, як праляцела адведзеная гадзіна. Уразіла гукавое суправаджэнне. І мне, як прыхільніку камп'ютарных гульняў, спадабаліся многія рэчы з абсталявання: карты, каскі, прадметы мэблі і адзення. Адзінае, хацелася б, каб гульня ішла хаця б на паўгадзіны больш. Нам часу не хапіла. І вось яшчэ: арганізатары забараняюць фатаграфаваць. Зразумела, што гэта ў нейкім сэнсе камерцыйная тайна, але так хацелася б зрабіць кадр-другі для «Інстаграма».

Сёння ў Мінску налічваецца трынаццаць квэст-пляцовак, кожная з якіх прапануе два і больш варыянтаў развіцця сюжэту гульні. У сярэднім на чалавека такая забава абыходзіцца ў 200 тысяч рублёў (у залежнасці ад канкрэтнага квэста і колькасці гульцоў). Працуюць пляцоўкі сем дзён на тыдні і, каб не прайграць канкурэнтам, прапановы ўвесь час абнаўляюцца. Такім чынам, у беларусаў ёсць магчымасць выпрабаваць сваю кемлівасць у самых розных сітуацыях. Хто ведае, што нам у жыцці можа спатрэбіцца заўтра?..

Дар'я АРЭФ'ЕВА,
студэнтка IV курса Інстытута журналістыкі БДУ.

Народны альбом

КАКТЭЙЛЬ ДЛЯ СЛЫХУ

Гурт «Кактэйль Шаляпіна» ў канцы мінулага года запусціў краўдфандынгавы праект. Для Беларусі гэтая з'ява не новая, але яна яшчэ толькі набірае абароты. На сёння толькі тры беларускія гурты здолелі паспяхова сабраць неабходныя для запісу сродкі, сярод якіх і «КШ». Грошы пойдуць на першы альбом «Рэаніматары».

Яны не маюць прадзюсара, у складзе калектыву — Аляксандр Юркоў (барабаны), Маргарыта Нога (скрыпка, бэк-вакал), Андрэй Сянькевіч (гітара, клавішныя, бэк-вакал), Дзмітрый Балтрукевіч (аўтар слоў, вакал, акустыка). Музыканты прапагандуюць сябе як «жывы» гурт з «жывым» слухачом, таму і такі важны крок, як запіс альбома, вырашылі зрабіць сумесна. Гэта дае магчымасць пераканацца, што ў калектыву ёсць свае прыхільнікі, якім не ўсё адно і яны гатовы падтрымаць музыкантаў у любы час.

Штуршком для напісання песень становіцца любая жыццёвая дробязь, новы досвед ці ўражанне. Напрыклад, загалоўную кампазіцыю Дзмітрый напісаў пасля рэанімацыі, калі пераасэнсоўваў жыццё. І таму музыканты праз творчасць спрабуюць даць падставу задумацца пра нешта важнае...

...Усё пачалося з аўтарскай песні, да якой у хуткім часе дадалася лірыка скрыпкі. Першае выступленне было ў якасці дуэта на свяце вулічнай музыкі ў верасні 2011 года. Далей гурт пачаў хутка папаўняцца новымі ўдзельнікамі і інструментамі, аднак найбольш сфарміраваны гук атрымаў за апошні год. Музыканты прапагандуюць сябе як творцы, не выконваюць кавер-кампазіцый. Назва «Кактэйль Шаляпіна» прыйшла выпадкова. За аснову ўзяты напой для рэаніміравання голасу, які складаецца з мёду, лімона, яйка і каньяку. Сярод спевакоў яго называюць менавіта кактэйлем Шаляпіна.

Гурт не цураецца эксперыментаў, таму падчас сваіх выступленняў музыканты могуць мяняцца месцамі.

— Наш барабаншчык Аляксандр неяк прыйшоў і заявіў, што гатовы прэзентаваць свой варыянт песні «Аўгуст Раш». Узяў гітару і заспяваў, я сеў за барабаны... Гэта і было пачаткам хаосу, які мы часам распачынаем на выступленнях *(усміхаецца)*.

У гурта пакуль што няма песень на беларускай мове. Але, па словах вакаліста, толькі часова:

— Я стаўлюся да пытання вельмі сур'ёзна. Лічу, што да гэтага трэба прыйсці, мову трэба адчуваць, а не проста прытрымлівацца трэнду. Тады і песня народзіцца сама, без «прабіркі».

Кацярына ЛЯСУН.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
23 07 2015 г.

Выпрабавана на сабе

Маці і старэйшая сястра на 18 дзён

Наша аўтарка правяла іх у дзіцячым лагеры

Калі я была школьніцай, кожнае лета адпачывала ў дзіцячых аздараўленчых лагерах. Было весела і запамінальна! Гэтым летам мне захацелася зноў паехаць у лагер, толькі цяпер ужо не на адпачынак, а працаваць.

Сябры вельмі здзівіліся, калі даведаліся пра маё жаданне. «Навошта табе гэта?», «Ну і які з цябе педагог?» — даводзілася чуць ад іх. Але жаданне спазнаць новае, паспрабаваць свае сілы ў іншай сферы дзейнасці было моцным, у дадатак захацелася даказаць навакольным, што я не «лыкам шытая» і змагу дасягнуць пастаўленай мэты.

Працоўнае месца шукала праз інтэрнэт. Дапамог сайт БРСМ, дзе ў раздзеле «Праца» быў змешчаны спіс дзіцячых аздараўленчых летнікаў, якім патрабаваліся студэнты ў якасці выхавальнікаў. Я адправіла па электроннай пошце сваё рэзюмэ ў некалькі раённых камітэтаў БРСМ. У выніку мяне запрасілі на працу ў лагер «Нёман», што знаходзіцца побач з вёскай Каўшова ў Мастоўскім раёне.

Для таго, каб працаваць выхавальнікам у лагеры, аднаго жадання мала. Неабходна здаць дзясятак медыцынскіх аналізаў: да дзяцей абы-каго не дапусцяць. Першае пытанне працадаўцаў тычылася майго ўзросту, бо ў лагеры адпачываюць дзеці і падлеткі 16-17 гадоў...

Выхавальніцкі калектыў сабралі ў лагеры за дзень да пачатку змены. Тады я і высветліла, што працаваць давядзецца побач з будучымі педагогамі і маладымі спецыялістамі, якія толькі пачалі свой настаўніцкі шлях. Напрыканцы першай «планёркі» дырэктар летніка Алена Францаўна Лючык сказала вельмі трапныя словы: «Будзьце пільнымі! І не забывайце, што вольны час у вас будзе толькі пасля адбою і да пад'ёму дзяцей». На справе так і атрымалася.

У мае абавязкі ўваходзіла праца з дзецьмі ў атрадах тады, калі ў іх выхавальніка былі выхадныя, і падрыхтоўка некалькіх мерапрыемстваў. У цэлым за 18 дзён я паспела прымераць на сябе вельмі розныя ролі. Для самых маленькіх дзетак прыйшлося быць маці, для падлеткаў — старэйшай сястрой, а на рэпетыцыях канцэртаў — аб'ектыўным крытыкам. Але пра ўсё па парадку.

Ужо ў першы дзень змены мы разам з калегамі сутыкнуліся з цяжкасцямі. Дзяцей усіх узростаў не цікавіла нічога, акрамя смартфонаў і планшэтаў. Цяпер гэта не дзіўна, тым больш калі нават ты, выхавальнік, пастаянна трымаеш у руцэ гаджэт. «Станьце прыкладам», — успомнілася мне ці то з рэкламы, ці то са школы. Я ўзяла мяч і разам з адной дзяўчынкай пайшла на валейбольную пляцоўку; праз 10 хвілін да нас далучыліся яшчэ некалькі чалавек, праз паўгадзіны падышлі яшчэ. Гэта была хоць маленькая, але перамога!

Увогуле, быць прыкладам для дзяцей даводзілася пастаянна. У тваім пакоі чыста — і дзеці імкнуцца навесці парадак, ты з'ядаеш у сталовай усё — і дзеці паказваюць табе пустыя талеркі, ты ў ціхі час спіш — і яны засынаюць.

Летні лагер для многіх дзяцей — месца, дзе яны ўпершыню могуць адчуць сябе самастойнымі. Але ў большасці выпадкаў дзеці да гэтага не гатовыя. Менавіта выхавальнік сочыць за тым, каб усе 25 выхаванцаў ранкам пачысцілі зубы, увечары памылі ногі; дзяўчаткам абавязкова трэба рабіць прычоскі. А калі ўзнікае неабходнасць, ты павінен памыць дзіцячую бялізну. Пра стомленасць забудзьце. Да таго ж дзеці ўсё адчуваюць, яны заўважаюць кожную дробязь. Аднойчы, калі я працавала ў атрадзе самых маленькіх, перад адбоем да мяне падышоў хлопчык Юра і спытаў: «А колькі ў вас дзяцей? Вы клапоціцеся пра нас так, нібыта мы вашыя, родныя...» Напэўна, гэта было самае нечаканае і ў той жа момант самае прыемнае, што мне даводзілася пачуць ад дзіцяці.

Кажуць, што калі ты педагог, дык да ўсіх дзяцей павінен ставіцца аднолькава, але я зразумела, што гэта немагчыма, хаця б таму, што ўсе дзеці розныя. Так, напрыклад, самае цеснае сяброўства ў мяне завязалася з Захарам Маркачанкам з апякунскай сям'і. Хлопчык прыехаў у «Нёман» ужо трэці раз, і супрацоўнікі лагера папярэдзілі выхавальнікаў, што з ім будзе няпроста. І сапраўды: калі ўсе ішлі на мерапрыемства, ён уцякаў на арэлі, падчас дыскатэкі сядзеў у альтанцы. Такім паводзінам я знайшла толькі адно тлумачэнне: дзіця патрабуе ўвагі да сябе. Мы заклікалі хлопчыка да ўдзелу ва ўсіх магчымых гульнях і спаборніцтвах і нават не заўважылі, што праз некаторы час ужо не маглі без яго абыходзіцца.

Камандзіры атрадаў уздымаюць сцяг лагера на адкрыцці змены.

Змена доўжылася толькі 18 дзён, а мне здаецца, што я паспела пражыць маленькае асобнае жыццё. Побач з дзецьмі атрымалася не толькі ўспомніць, як гэта — быць бесклапотнай, але і зразумець, што такое сапраўдная адказнасць за кагосьці, акрамя сябе. І нехай у мяне няма педагагічнай адукацыі, спадзяюся, што дзеці змаглі ад мяне чаму-небудзь навучыцца. Бо, як казаў знакаміты пісьменнік і педагог Антон Макаранка: «Выхаванне ў тым і заключаецца, што больш дарослае пакаленне перадае свой досвед, свае захапленні, свае перакананні малодшаму пакаленню»...

Ганна КУРАК, студэнтка III курса Інстытута журналістыкі БДУ.
Фота аўтара.

З досведу актыўных

САМАКІРАВАННЕ: АД ІДЭІ ДА ПРАЕКТА

Братэрства арганізацый студэнцкага самакіравання (БАСС) арганізавала ў Мінску «Летнюю сустрэчу актыўных студэнтаў», якая аб'яднала прадстаўнікоў не толькі сталічных, але і абласных ВНУ. Актывісты разам з валанцёрамі і экспертамі, якіх запрасілі, на працягу трох дзён спрабавалі разабрацца ў пытаннях самакіравання.

Першакурснік БНТУ Дзмітрый Рапапорт удзельнічае ў сустрэчах БАСС ужо другі раз. «Падабаецца атмасфера: тут яна вучэбная і ў той жа час гульнявая. Лекцыі чытаюць на нязвыклыя тэмы, такіх ва ўніверсітэтах няма. Асабліва спадабалася выступленне эксперта з Літвы, які расказваў пра Балонскі працэс, — дзеліцца ўражаннямі хлопец. — Прыемна, што ўсе ўдзельнікі актыўныя, ніхто не адседжваецца ў куточку, кожны мае сваю думку».

Старшы выкладчык юрыдычнага факультэта БДУ Яраслаў Кот прачытаў студэнтам лекцыю «Этыка: даступна пра галоўнае», падчас якой на прыкладах растлумачыў ключавыя паняцці гэтай навукі. Яраслаў расказаў пра сваё навучанне ў ЗША, Вялікабрытаніі і Расіі, падзяліўся ўласнымі назіраннямі за сістэмамі самакіравання за мяжой і іх уплывам на адукацыю. Выкладчык звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што на Захадзе прэстыж дыплома вну залежыць яшчэ і ад саміх выпускнікоў, якія нават пасля заканчэння вучобы клапоцяцца пра сваю альма-матар.

— На «Летняй сустрэчы» я ўпершыню пачуў пра методыку форум-тэатра, якая дапамагае пераконваць людзей. Упэўнены, што аднойчы мне гэта абавязкова спатрэбіцца. Таксама карыснымі былі заняткі па аратарскім майстэрстве. Кожны лідар, у тым ліку студэнцкі, павінен ім валодаць, — расказвае Артур Пазняк, студэнт II курса біялагічнага факультэта БДУ.

Адзін са значных плюсоў семінара — тое, што ён накіраваны не толькі на атрыманне ведаў удзельнікамі ад валанцёраў, але і на абмен досведам паміж навучэнцамі розных установ.

Трэба адзначыць, што падобныя мерапрыемствы БАСС праводзіць некалькі разоў на год, пачынаючы з 2009-га (інфармацыю пра іх можна знайсці на афіцыйным сайце і ў суполках сацсетак). Нярэдка ідэі, якія з'яўляюцца ва ўдзельнікаў падчас сустрэч, пасля ператвараюцца ў сур'ёзныя праекты ва ўніверсітэтах.

Ганна КУРАК.

БЫЦЬ У СЯДЛЕ!

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар «ЧЗ».)

Каб не так хваляваліся. Дарэчы, самым распаўсюджаным аргументам, чаму мама і тата не хочуць аддаваць сваё дзіця ў конны спорт, з'яўляецца яго траўматычнасць.

— У кожным відзе спорту ёсць свае нюансы. І рызыка будзе заўсёды. Гэта нармальна. Іншая справа, як зрабіць так, каб непрыемных сітуацый амаль не было. З гэтай задачай у нас добра спраўляюцца трэнеры, — тлумачыць **начальнік вучэбна-спартыўнага аддзела РЦАП коннага спорту і конегадоўлі Святлана СІРОТКІНА.**

Другая змена дзённага конна-спартыўнага лагера сабрала 30 юных наезнікаў. Усе яны — выхаванцы цэнтра. Ліпеньская змена праводзіцца для тых, хто займаецца конным спортам трэці-чацвёрты год. Кожны з такіх падлеткаў ужо прайшоў пачатковую падрыхтоўку і трапіў у адно з трох спартыўных аддзяленняў: трохбор'я, выездкі ці пераадольвання перашкод. Каня для заняткаў і ўдзелу ў спаборніцтвах хлопцам і дзяўчатам прадастаўляе цэнтр. Дзеці шмат трэніруюцца і абавязкова сочаць за здароўем свайго сябра.

— Я дзесяць гадоў займалася акрабатыкай, але заўсёды марыла быць бліжэй да коней. І вось калі бацькі вырашылі пераехаць ў Мінск, адразу ўзгадала пра Ратамку. Спачатку было цяжка звыкнуцца з тым, што пасля заняткаў адразу дадому не пабяжыш. Чаму? Таму што каня, як інвентар, на паліцу не пакладзеш. Жывёлу трэба супакоіць, памыць, пачысціць, — расказвае выхаванка цэнтра Паліна Дунаева.

І сапраўды, падлеткі шмат часу аддаюць любімаму занятку. Здаецца, яны правялі б каля коней увесь дзень!

ДАВЕР ЯК ГАРАНТЫЯ ПОСПЕХУ

Любы летнік — гэта, безумоўна, аздараўленне. А спартыўна-аздараўленчы лагер яшчэ і добрая магчымасць для юных наезнікаў зразумець усю спецыфіку гэтага спорту, трэнерам — лепш прыгледзецца да задаткаў сваіх выхаванцаў.

— Як вы лічыце, — звяртаецца да мяне **Уладзімір КРАЕЎСКІ, трэнер аддзела трохбор'я,** — што ў конным спорце самае цяжкае?

— Напэўна, утрымацца ў сядле, каб падчас спаборніцтваў і розных трукаў не апынуцца на зямлі...

— У чымсьці вы маеце рацыю. Але каб не зваліцца з каня, трэба не проста моцна трымацца, а перш за ўсё неабходна навучыцца давяраць жывёле. Вы павінны прыручыць яе, дабіцца ад яе паслухмянасці.

Першая палова дня ў лагеры — гэта трэніроўкі. Летам іх больш за тры гадзіны. Гэта, як лічаць падлеткі, не шмат, але і ў вольны час таксама можна быць побач з любімымі жывёламі.

«Каб не зваліцца з каня, трэба не проста моцна трымацца, а перш за ўсё неабходна навучыцца давяраць жывёле. Вы павінны прыручыць яе, дабіцца ад яе паслухмянасці».

— У маёй бабулі ў вёсцы ёсць конь. Я з ім пасябравала, але ісці ў канкур жывёла не хоча. Не прывыкла яна да гэтага! Яе праца іншая — воз цягнуць, па гаспадарцы дапамагаць, — жартуе выхаванка цэнтра Ліяна Кароткіх.

Цікава, што ўсе коні цэнтра выведзены на мясцовым конным заводзе і належаць да асаблівай тракененскай пароды. У музеі коннага спорту і конегадоўлі асобны стэнд прысвечаны гісторыі гэтай пароды і найлепшым яе прадстаўнікам. Дарэчы, менавіта ў Ратамцы праходзіла падрыхтоўку Ірына Ліс, спартсменка, якая прадстаўляла Беларусь на Алімпійскіх гульнях у Афінах і Пекіне.

— Мы не можам гарантаваць, што ўсе выхаванцы цэнтра вырастуць чэмпіёнамі. Але тое, што кожны наезнік набудзе такія якасці, як мэтанакіраванасць, спрытнасць і адказнасць, сказаць магу са стапрацэнтнай упэўненасцю! — дзеліцца Уладзімір Краеўскі.

Фота Надзеі БУЖАН.

Юныя спартсмены даглядаюць сваіх чатырохногіх напарнікаў з пяшчотай і клопатам.

Давер у спартыўным дуэце — гарантыя поспеху!

СКАЧУЦЬ НЕ ТОЛЬКІ КОНІ

Другая палова дня ў лагеры — гэта час гульняў і тэматычных віктарын. У вольны час падлеткі з захапленнем чытаюць кнігі пра коней, іх звычкі, асаблівасці характару, глядзяць фільмы, дзе галоўная роля абавязкова належыць іх любімай жывёле. Акрамя гэтага, юныя вершнікі ладзяць сапраўдныя спаборніцтвы паміж сабой. Хлопцы і дзяўчаты вызначаюць, хто з іх самы хуткі, спрытны і вынослівы спартсмен. Дарэчы, перад тым, як пачаць займацца у конна-спартыўным цэнтры, дзеці абавязкова здаюць нарматывы па скачках, адцісканні, бегу.

— Аднойчы да нас прыйшла незадаволеная бабуля з пытаннем: «Навошта маёй унучцы бегаць і скакаць? Гэта ж коні павінны рабіць, а не людзі!» Насамрэч без фізічнай падрыхтоўкі ў гэтым спорце ніяк не абысціся, а яна ў цяперашніх дзяцей вельмі слабая, — распавядае Святлана Сіроткіна. — Як наезнікі збіраюцца кіраваць конямі, калі самі прабегчы сто метраў без моцнай задышкі не могуць?!

Выхаванцы цэнтра і трэнеры расказваюць, што верхавая язда танізуе ўвесь арганізм, асабліва сэрца і сасуды, нармалізуе работу дыхальнай сістэмы. Акрамя таго, паездкі верхам станоўча ўплываюць не толькі на фізічны стан арганізма, але яшчэ і на псіхіку. Такія рэгулярныя заняткі здольны пазбавіць чалавека ад дэпрэсіі і бяссонніцы.

— Заўсёды думала, што ў конным спорце больш хлопцаў, чым дзяўчат. Але цяпер бачу, што гэта не так. За ўвесь час знаходжання ў лагеры не сустрэла ніводнага юнака! — здзіўляюся я.

— Дзяўчаты больш адказныя і клапатлівыя. А коням гэта неабходна! Да таго ж смеласці і зацятасці ў прыгожай паловы чалавецтва дастаткова! У конным спорце вынікаў адразу не даб'ешся, але калі ўпэўнена і доўга ісці да сваёй мэты — усё абавязкова атрымаецца, — тлумачыць Уладзімір Краеўскі.

Ці стануць сённяшнія выхаванцы лагера ў Ратамцы чэмпіёнамі коннага спорту, пакуль невядома. Але з упэўненасцю можна сказаць, што юныя спартсмены добра ведаюць сваю справу і адчуваюць тых, каго яны завуць сваімі напарнікамі.

Кацярына АСМЫКОВІЧ.

ПА РАБОЧУЮ ПРАФЕСІЮ — У... ГІМНАЗІЮ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)



У гімназіі ёсць свая студыя гуказапісу.

Скажам, зараз яе вучні шчыруюць над рэалізацыяй эстонскага праекта — распрацоўваюць канструкцыі для дзіцячых пляцовак, якія будуць усталяваны ў правінцыйных мястэчках у Эстоніі, а затым самі і выраблюць іх.

— Для нас вельмі важнае значэнне мае сацыяльны аспект праекта, бо ў цэнтры ўвагі — патрэбы дзяцей. Да таго ж гэтая праца вымагае сур'ёзных падыходаў да пытанняў захавання якасці і бяспекі, — падкрэслівае Хелена.

МУЗЫКА ПЛЮС КРЭАТЫЎНАСЦЬ

А побач з будучымі фрэзероўшчыкамі і зваршчыкамі навучаюцца і будучыя музыканты. Трэба патлумачыць, што ў Швецыі вельмі ганарацца сваёй музычнай адукацыяй, бо гэтая краіна трэцяя пасля ЗША і Вялікабрытаніі ў свеце па аб'ёмах грашовых паступленняў ад музычнага экспарту. Вядомыя амерыканскія і англійскія спевакі прыязджаюць у Швецыю, дзе для іх пішуць новыя песні, а шведскія прадзюсары прасоўваюць новы музычны прадукт на рынак.

Ці варта тлумачыць, чаму ў Оскарсхамне так ганарацца тым, што дваццаць гадоў таму менавіта іх гімназія трапіла ў кола навучальных устаноў, дзе было вырашана адкрыць музычны профіль.

Кожны вучань, які яго выбірае, асвойвае як мінімум два музычныя інструменты плюс вывучае шэраг профільных музычных дысцыплін. Тут ёсць як навічкі (знаёмства з музычным інструментам можна пачаць увогуле з нуля), так і больш вопытныя вучні. Групы фарміруюцца ў залежнасці ад узроўню падрыхтоўкі падлеткаў.

— Зусім неабавязкова выбар музычнага профілю ў гімназіі азначае, што нашы вучні звяжуць сваю прафесійную будучыню менавіта з музыкай. Яны становяцца і ўрачамі, і вучонымі, а музыка дапамагае ім развівацца ўсебакова. Мы ў першую чаргу выхоўваем крэатыўных і творчых людзей, — падкрэслівае **настаўніца музыкі Крысціна ЛІНДВАЛЬ,** — а з такімі якасцямі чалавеку прасцей самарэалізавацца ў дарослым жыцці.

Дарэчы, у гімназіі ёсць асобны пакой са спецыяльнай камп'ютарнай тэхнікай, дзе будучыя музыканты і аранжыроўшчыкі могуць працаваць над кампазіцыяй, а таксама ўласная студыя гуказапісу.

У 20 ГАДОЎ — ЗНОЎ У ШКОЛУ

Між іншым, выбіраць у гімназіі той ці іншы профіль навучання зусім не абавязкова. Хтосьці з задавальненнем атрымлівае паралельна і агульную сярэднюю адукацыю, і прафесію (такіх прыкладна 30-40% ад агульнай колькасці старшакласнікаў), але пэўная частка вучняў першапачаткова нацэлена на працяг навучання ў вышэйшай школе. І ў іх ужо крыху іншая праграма навучання. Увогуле ўсе гімназічныя праграмы складаюцца з пэўнай колькасці курсаў. Некаторыя курсы, такія як англійская мова, з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх напрамкаў. Вельмі папулярная ў гімназістаў тэарэтычная грамадазнаўчая праграма, якая адкрывае шырокія магчымасці пры выбары будучай спецыяльнасці ў вну. Ніякіх дадатковых іспытаў пры паступленні ў гімназію не праводзіцца. Але калі колькасць жадаючых перавышае магчымасці гімназіі, на самых папулярных профілях можа адбывацца адбор па ацэнках за дзевяцігадовую школу.

Для беларусаў даволі дзіўна, што прыйсці вучыцца ў гімназію ў Швецыі можна да дваццаці гадоў. Таму ў 16-гадовых падлеткаў, якім пасля атрымання абавязковай дзевяцігадовай адукацыі не хацелася далей вучыцца, ёсць час перадумаць.

І нават старшакласнікі, якія асвойваюць у гімназіі рабочую прафесію, не адсякаюць для сябе шляхі для паступлення ў вну. Вышэйшыя навучальныя ўстановы ў Швецыі ў залежнасці ад той ці іншай спецыяльнасці ўстанаўліваюць пэўныя патрабаванні да ўзроўню вывучэння таго ці іншага школьнага прадмета (усё гэта адлюстроўваецца ў «школьным атэстаце»). Ведаючы гэта, можна яшчэ ў старшых класах дабавіць сабе індывідуальна дадатковыя гадзіны па пэўных прадметах.

Больш за тое, нярэдка рашэнне паступаць у тую ці іншую вну прыходзіць ужо пасля заканчэння гімназіі, і тады, каб падрасці да патрабаванняў вышэйшай школы, маладыя людзі зноў вяртаюцца сюды і «дабіраюць» патрэбныя веды па пэўных школьных прадметах. Для маладых людзей, якім ужо споўнілася 20 гадоў, пры гімназіі дзейнічае спецыяльнае аддзяленне для дарослых.

Дарэчы, навучанне ў Швецыі бясплатнае: як у школе, гімназіі (хоць у краіне дзейнічае таксама і сетка прыватных школ), так і ў вну.

— Вельмі важна, што выбар, зроблены сёння, не абмяжоўвае магчымасці маладых людзей у будучыні, — падкрэслівае **дырэктар гімназіі Ніклас ХАМАР,** — і ў маладых людзей заўсёды ёсць магчымасць змяніць сваю адукацыйную траекторыю.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота аўтара.
nikalaeva@zviazda.by

Медыяджунглі

«ВІКІПЕДЫЯ» — ТОЛЬКІ ТРАМПЛІН

Чаму так важна выхаваць у падлеткаў крытычнае стаўленне да любой крыніцы інфармацыі

У Швецыі ўжо шмат гадоў паспяхова рэалізуецца праграма медыяасветы: афіцыйна інтэгравана ў нацыянальны вучэбны план. Такім чынам, няма неабходнасці прыдумляць розныя спецкурсы і ламаць галаву, за кошт якога прадмета ўціснуць у навучальны план патрэбныя веды. Для павышэння медыяадукаванасці падыходзяць урокі геаграфіі і гісторыі, хіміі і біялогіі. У навучальнай праграме занатавана, што педагогі павінны выкарыстоўваць на ўроках як мага больш прыкладаў, блізкіх вучням. Гэта могуць быць дасягненні спартсменаў, геаграфічныя звесткі, паказчыкі ўзроўню беспрацоўя і гэтай далей. Каб абараніць дзяцей ад шкоднага ўздзеяння медыя, іх вучаць у школе адсейваць і аналізаваць медыяпаведамленні, распазнаваць маніпуляцыі, якія выкарыстоўваюцца пры стварэнні і перадачы інфармацыі рознымі СМІ, развіваюць у вучняў здольнасць знаходзіць праўдзівую і дакладную інфармацыю, назіральнасць і крытычнае мысленне.

Хуткая ці праўдзівая?

— Мы лічым, што трэба вельмі крытычна ставіцца да ўсяго, што мы бачым і што чытаем, асабліва ў інтэрнэце. Магчыма, праз колькі гадоў ужо не будуць друкавацца ні кнігі, ні энцыклапедыі, а ўсю інфармацыю можна будзе знайсці ў сусветным сеціве, — дзеліцца сваім бачаннем сітуацыі **настаўнік грамадазнаўства Оке НІЛЬСАН.** — Скажам, у Швецыі калісьці выдавалася нацыянальная энцыклапедыя, якая з 2000 года стала даступная ў інтэрнэце. Цяпер яна вельмі аператыўна абнаўляецца. Але, у адрозненне ад іншых інтэрнэт-крыніц, мы ведаем, хто над ёй працуе і нясе адказнасць за праўдзівасць выкладзенай на інтэрнэт-старонках інфармацыі. Я звычайна стаўлю сваім вучням нездавальняючыя адзнакі, калі ў якасці адзінага рэсурсу інфармацыі яны выкарыстоўваюць «Вікіпедыю».

Настаўнік грамадазнаўства Оке НІЛЬСАН: «Галоўнае — даць вучням інструменты, якія дапамогуць ім выжыць у інфармацыйных джунглях».

Трэба сказаць, што з самага свайго заснавання ў студзені 2001 года свабодная інтэрнэт-энцыклапедыя ператварылася ў прадмет крытыкі і нападак. Прычына ў тым, што практычна кожны можа ўносіць сваю лепту ў энцыклапедычныя артыкулы. «Wiki» ў перакладзе азначае «хуткі» — «хуткая энцыклапедыя». «Вікіпедыя» ствараецца добраахвотнікамі з усяго свету на 285 сусветных мовах. Усяго ў ёй прадстаўлена ўжо больш як 35 мільёнаў артыкулаў. Свабодная энцыклапедыя ўваходзіць у пяцёрку самых папулярных вэб-сайтаў у свеце.

Існуюць тысячы старонак, напоўненых недакладнай інфармацыяй. Нават стваральнікі праекта папярэджваюць, што «Вікіпедыя не гарантуе праўдзівасці». Тым не менш мільёны людзей усё роўна чэрпаюць факты і лічбы з гэтага рэсурсу, пачынаючы з інфармацыі для школьных хатніх заданняў і заканчваючы карпаратыўнымі прэзентацыямі.

Выкладчык медыя, журналіст Коні БЛАМАНДЭР дэманструе створаны яго вучнямі часопіс.

На ўроку па медыяадукацыі.

Давярай, але правярай

У гімназіі горада Оскарсхамн студэнтаў вучаць, як правільна працаваць з «Вікіпедыяй» і як правяраць выкладзеную там інфармацыю. Самы актыўны ўдзел у гэтай рабоце прымаюць **супрацоўнікі школьнай бібліятэкі — Анет СВОД (дарэчы, журналіст па адукацыі) і Лінда КРУНСТОЛЬ.**

— Знайсці інфармацыю ў інтэрнэце нескладана. Складана яе адсартаваць, — кажа Анет. — Інтэрнэтстора ўяўляе сабой своеасаблівую кашу, дзе можна знайсці ўсё: і сайты ўльтраправых арганізацый, і блогі, і даведачныя рэсурсы, і сур'ёзныя навуковыя работы. У вучэбных планах шведскай школы запісана, што пасля заканчэння вучобы выхаванцы павінны валодаць навыкамі пошуку і адбору інфармацыі на лічбавых платформах. Усе пошукі нашых вучняў распачынаюцца ў Google, а значыць, яны аўтаматычна трапляюць у «Вікіпедыю». Гэты даведачны рэсурс пошукавая сістэма прапануе ім у ліку першых. Падлеткі ўпэўнены, што ў Google можна знайсці ўсё, а калі яны чагосьці там не знаходзяць, значыць, гэтай інфармацыі няма нідзе ў прынцыпе. Зайшоўшы на «Вікіпедыю», непадрыхтаваны спажывец інфармацыі можа там проста захраснуць і ўжо далей нічога не шукаць. Вось чаму так важна выхаваць у падлеткаў крытычнае стаўленне да любой крыніцы інфармацыі.

Педагогі прапануюць сваім вучням пры пошуку інфармацыі ў інтэрнэце адказаць на шэраг пытанняў. **Кто стварыў гэту старонку? Ці можна ёй давяраць? Ці можа прадстаўленая на ёй інфармацыя адпавядаць рэчаіснасці? Перад вамі першакрыніца або перадрукаваная інфармацыя (бо пры шматразовым пераказе адной і той жа інфармацыі атрымліваецца гульня ў сапсаваны тэлефон)? Хто можа быць зацікаўлены ў гэтай інфармацыі? Ці ёсць у аўтара асабістая зацікаўленасць? Наколькі аб'ектыўная прадстаўленая інфармацыя або яна адлюстроўвае толькі адзін пункт погляду? Якая ў сайта мэтавая аўдыторыя?**

— Мы просім вучняў звяртаць увагу, на якія крыніцы спасылаецца сайт, і не стамляемся паўтараць: ніколі не спыняйцеся на адной крыніцы інфармацыі, шукайце пацвярджэнне, супастаўляйце, каб пераканацца, што інфармацыя адпавядае рэчаіснасці. А «Вікіпедыю» апраўдана выкарыстоўваць як трамплін для далейшага пошуку інфармацыі, але затым трэба шукаць першакрыніцы (свабодная інтэрнэт-энцыклапедыя захоўвае інфармацыю пра ўсіх аўтараў, якія ўносілі ў артыкул карэкціроўкі) і пераходзіць на іх, — падкрэслівае Крысціна. — Яны часта вартыя ўвагі. У любым выпадку гэта лепш, чым іх вольны пераказ.

Валанцёры-добраахвотнікі

У Швецыі правялі даследаванне і ўстанавілі, што самымі актыўнымі аўтарамі «Вікіпедыі» з'яўляюцца маладыя мужчыны ва ўзросце да 25 гадоў, прадстаўнікі еўрапейскай расы, не жанатыя, без дзяцей, з тэхнічнай адукацыяй. А паколькі інтэрнэт-кантэнт стварае пераважна адна група ў грамадстве, то і змест прадстаўлены ў ім пераважна аднабакова. Напрыклад, адна з любімых тэм, якую любяць карэктаваць добраахвотнікі, — парніковы эфект (ён займае пяты радок па частаце ўнясення карэкціровак).

Дарэчы: медыяпрофіль — вельмі папулярны ў гімназістаў напрамак навучання, хоць зусім не многія збіраюцца звязаць сваё далейшае жыццё з журналістыкай. Лічыцца, што ён дае ўсебаковае развіццё. Старшакласнікі вывучаюць законы і правілы, па якіх жывуць медыя, даведваюцца, як медыя ўплываюць на грамадства, і наадварот, самі займаюцца стварэннем медыяпрадуктаў. У гэтым ім дапамагае прафесійны журналіст, які прыйшоў працаваць у школу, **Коні БЛАМАНДЭР.** Задача педагогаў і журналіста-прафесіянала — навучыць маладых людзей крытычнаму ўспрыманню медыя, у тым ліку і праз стварэнне ўласных медыяпрадуктаў.

— Мы вучым нашых студэнтаў нікому не давяраць і ўсё перапраўвяраць. Гэта самае цяжкае — навучыцца адрозніваць праўду ад хлусні. Сваю задачу бачым у тым, каб даць маладым людзям інструменты, якія дапамогуць ім выжыць у інфармацыйных джунглях, — дадаў Оке Нільсан.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота аўтара.
nikalaeva@zviazda.by

Мінск — Кальмар — Оскарсхамн — Мінск.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 04 АВГУСТА 2015 ГОДА ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ С УСЛОВИЯМИ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, ПРИНАДЛЕЖАЩЕГО ОАО «РЕММЕХ»

Сведения о предмете торгов (продаваемом имуществе)				
№	Наименование, характеристики имущества, входящего в состав предмета торгов	Местонахождение предмета торгов	Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб.	Размер задатка, бел. руб.
1.	Административное помещение общей площадью 289,3 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145924 (назначение: административное помещение) 1-й этаж 4 этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-2	2 812 120 416	280 000 000
2.	Административное помещение общей площадью 402,8 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145928 (назначение: административное помещение) 3-й этаж 4 этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-6	3 929 846 544	390 000 000
3.	Административное помещение общей площадью 408,9 кв. м, инвентарный номер 500/D-708145929 (назначение: административное помещение) 4-й этаж 4 этажного здания	г. Минск, ул. Бабушкина, 48-7	3 967 031 376	396 000 000

Наличие обременений: залог, аренда.
Продавец имущества: ОАО «Реммех», ул. Бабушкина, 48, 220024, г.Минск.
Организатор торгов: УП «Минский городской центр недвижимости», ул. К. Маркса, 39, к.10, 220030, г. Минск.

Условие торгов: победитель торгов (покупатель) оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 1 процента от цены продажи предмета торгов, указанной в протоколе о результатах торгов, в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Торги проводятся в соответствии со ст.ст. 417, 418 Гражданского кодекса Республики Беларусь и порядком проведения аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Реммех», утвержденным организатором торгов.

К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток и заключившие соглашение с организатором торгов о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона по соответствующему предмету торгов, а также представившие организатору торгов следующие документы:

заявление на участие в аукционе (по форме, установленной организатором торгов); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения аукциона (по форме, установленной организатором торгов); копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); копию платежного документа о внесении задатка; документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица; а также, при необходимости, иные документы в соответствии с порядком проведения аукциона.

Задаток (задатки) перечисляется на расчетный счет УП «Минский городской центр недвижимости» № 3012104971019 в региональной дирекции №700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, код 153001369, УНП 190398583 в срок, установленный для приема документов на участие в аукционе.

Торги проходят в форме открытого аукциона с условиями на повышение начальной цены. Торги проводит аукционист, определенный организатором торгов. В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов, а наивысшая цена (цена продажи) фиксируется в протоколе о результатах торгов и включает НДС. В ходе торгов участники могут предлагать свою цену за продаваемое имущество в соответствии с порядком проведения аукциона.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в них подано только одним участником или для участия в них явился только один участник, предмет торгов продается этому участнику (покупателю) при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Договор купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) заключается после предъявления копии платежных документов о перечислении суммы вознаграждения и подписывается в течение 3 рабочих дней со дня проведения торгов.

Оплата стоимости приобретенного имущества с учетом НДС осуществляется победителем торгов (покупателем) в течение 15 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи.

Торги проводятся 04 августа 2015 года в 14.30 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов. Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются с 23.07.2015 по 31.07.2015 включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00 (по пятницам – до 16.45) по адресу: г. Минск, ул. К.Маркса, 39, каб. 6.

По вопросу осмотра продаваемого имущества следует обращаться по телефонам: (017)291-83-56, (029)697-93-09.

Телефоны для справок:
(017)327-48-36 (УП «Минский городской центр недвижимости»);
(017)296-35-94, (017)291-83-56, (029)697-93-09 (ОАО «Реммех»).

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении 01 сентября 2015 г. аукциона по продаже в частную собственность земельного участка для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома в Знаменском сельском Совете Брестского района Брестской области

№ лота	Местоположение и кадастровый номер земельного участка	Площадь, га	Начальная (стартовая) стоимость земельного участка, руб.	Сумма задатка, руб.	Расходы на изготовление земельно-кадастровой документации, регистрацию земельного участка, руб.	Целевое назначение земельного участка
1.	Брестская обл., Брестский район, аг. Знаменка, ул. Спортивная, 8, 121280803101000791	0,1627	11 712 800	1 172 000	6 609 500 (возмещение расходов на объявления по акту выполненных работ, после размещения)	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома
2.	Брестская обл., Брестский район, аг. Збунин, ул. Шоссейная, 10А 121280802601000162	0,1846	13 119 700	1 312 000	11 688 600 (возмещение расходов на объявления по акту выполненных работ, после размещения)	Строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома

Земельный участок в аг. Знаменка, ул. Спортиваня, 8 ограничений в использовании земель не имеет. Земельный участок в д. Збунин, ул. Шоссейная, 10А на всей площади имеет ограничение в использовании земель в водоохранной зоне водного объекта р. Середовая в соответствии с Постановлением Совета Министров РБ от 21.03.2006 г. № 377. Подъезд к земельным участкам будет производиться по ул. Спортивной и по ул. Шоссейной. Имеется возможность подключения газа.

Аукцион будет проводиться 01 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу:
Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13 (в здании сельисполкома).

Для участия в аукционе необходимо подать заявление об участии в аукционе, копию платежного поручения, подтверждающего внесение на расчетный счет Знаменского сельисполкома № 3641 00000 0318 в ф-ле № 100 «ОАО АСБ Беларусбанк», код 150501246, УНП 200036617, код платежа 4901 суммы задатка в размере 10% от начальной цены земельного участка, документ (паспорт), подтверждающий личность покупателя.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: **Брестский р/н, аг. Знаменка, ул. Юбилейная, 13** (в здании сельисполкома) **с 8.00 до 13.00 и с 14.00 до 17.00** по рабочим дням. Последний срок подачи заявлений **25 августа 2015 г**. до 17.00.

Контактные телефоны: 95-51-35 , 95-51-36, 95-51-37.

ГАЙНЕНСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь земельного участка	Наименование инженерных сетей	Начальная цена (бел. рублей)	Задаток (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации
1	д. Логоза, уч. № 7, кадастровый номер 623280806401000309	0,1500	Подъездные пути удовлетворительные	19 478 600	3 895 700	13 067 100
2	д. Логоза, уч. № 8, кадастровый номер 623280806401000310	0,1500	Подъездные пути удовлетворительные	19 478 600	3 895 700	13 067 100
3	д. Путилово, уч. № 4, кадастровый номер 623280809601000062	0,1943	Подъездные пути удовлетворительные	13 490 000	2 698 000	5 195 260

Аукцион проводится 26.08.2015 года в 10.00 по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области, здание Гайненского исполнительного комитета. Документы принимаются ежедневно с 8.00 до 17.00, кроме субботы и воскресения, до 23 августа 2015 года (последний день подачи документов 22 августа до 17.00) по адресу: д. Логоза, ул. Центральная, д. 2 Логойского района Минской области.

Задаток перечисляется на р/с № 3600619021104 в ЦБУ № 611 в филиале 500 Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Логойск, ОКПО 04431493, УНН 600181697, Гайненский сельский исполнительный комитет, код платежа 04901. Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения протокола о результатах аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с подготовкой документации.

Контактные телефоны: 8 (01774) 56436, 56498.

Ведай нашых!

МАТЭМАТЫКА... НА ПУБЛІЧНЫХ ДЫСКУСІЯХ

Другое каманднае месца і сярэбраныя медалі заваявалі беларускія школьнікі на VII міжнародным турніры юных матэматыкаў (ITYM-2015), які прайшоў у Балгарыі.

Турнір уяўляе сабой калектыўныя (камандныя) спаборніцтвы, дзе ад удзельнікаў патрабуецца не толькі ўменне спраўляцца з рашэннем складаных матэматычных задач, але і аргументавана адстойваць свой пункт гледжання ў публічных дыскусіях.

Ён складаецца з некалькіх матэматычных баёў, у якіх каманды па чарзе дакладваюць свае даследаванні па прапанаваных заданнях, а таксама выступаюць у ролі апанентаў і рэцэнзентаў для іншых удзельнікаў. Агульныя правілы правядзення міжнароднага турніру заснаваны на правілах правядзення беларускага турніру юных матэматыкаў. І гэта невыпадкова. Наш рэспубліканскі турнір праходзіць ужо шмат гадоў, мае даўнія традыцыі і вялікі досвед (у снежні 2014 года прайшоў ужо 16-ты рэспубліканскі турнір юных матэматыкаў). Акрамя таго, у беларускім турніры часта прымаюць удзел замежныя каманды (з Расіі, Балгарыі, Казахстана, Украіны), а ў журы ўваходзяць прадстаўнікі з Францыі і Расіі.

Заяўкі на ўдзел у VII міжнародным турніры юных матэматыкаў падалі прадстаўнікі 13 камандаў з 9 краін. Канчаткова на турнір былі запрошаны 11 камандаў з 8 краін: Беларусі, Балгарыі, Бразіліі, Германіі, Грузіі, Расіі, Румыніі і Францыі.

Ва ўпартай барацьбе з традыцыйна моцнымі сапернікамі з Францыі, Германіі, Балгарыі і Расіі беларуская каманда выйграла два адборачныя баі, саступіўшы ў выніку толькі камандзе з Францыі.

У склад беларускай каманды ўвайшлі Дзіяна Фаміна (11 клас, ліцэй БДУ, капітан каманды), Мікіта Кандрацёнак (11 клас, гімназія № 41 г. Мінска), Мікалай Прохараў (11 клас, гімназія № 41 г. Мінска), Ліяна Хазалія (10 клас, гімназія № 41 г. Мінска), Сяргей Шаламберыдзэ (11 клас, СШ № 94 г. Мінска) і Арцём Глотаў (10 клас, гімназія № 1 г. Салігорска).

Рыхтавалі каманду да спаборніцтваў выкладчыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Прадстаўнікі БДУ ўваходзілі таксама і ў склад міжнароднага журы турніру.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

Государственное предприятие «Белаэронавигация» проводит процедуру переговоров по размещению заказа на разработку предпроектной документации по объекту «Реконструкция террас спальных корпусов и перепланировка спального корпуса № 5 ОК «Ракета» филиала по оздоровлению государственного предприятия «Белаэронавигация».
Конт. тел. +375 17 544-90-99, +375 17 510-39-04.
УНП 100035788

К СВЕДЕНИЮ АКЦИОНЕРОВ ОАО «СОВРЕМЕННЫЕ РОЗНИЧНЫЕ ТЕХНОЛОГИИ»

23 июля 2015 года в 12.00 по адресу:
г. Минск, ул. Берестянская, 17, 13-й этаж
состоится внеочередное общее собрание
акционеров ОАО «Современные розничные технологии».

Форма проведения собрания — очная.

Регистрация участников с 11.30 до 11.55. Для регистрации на собрании акционеру необходимо при себе иметь паспорт (для представителя акционера – паспорт и доверенность).

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. О реорганизации ОАО «Современные розничные технологии» (далее — Общество).
2. Об утверждении условий выкупа акций на баланс Общества по требованию акционеров.
3. Об избрании члена наблюдательного совета Общества.
4. О прекращении полномочий члена ревизионной комиссии Общества.
5. Об избрании члена ревизионной комиссии Общества.

Орган, созывающий собрание акционеров:
Наблюдательный совет ОАО «Современные розничные технологии», основание созыва: решение от 21.07.2015 (протокол № 12).

С материалами, подготовленными к собранию, акционеры могут ознакомиться **с 27.07.2015 по адресу: г. Минск, ул. Берестянская, 17, 13-й этаж по рабочим дням с 14.00 до 16.00,** а также в день проведения общего собрания акционеров по месту проведения собрания **с 11.30 до 11.55.**
УНП 690019195

ГРОДНЕНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

предлагает приобрести гостиничный комплекс «Гродно», расположенный в г. Гродно, ул. Поповича, 5.

За 74 млрд.руб. предлагаются 16 этажное кирпичное здание гостиницы, 1984 года постройки, площадью 12741 кв. м и 3 этажное здание ресторана «Гродно», 1985 года постройки, площадью 3471,0 кв. м.

За дополнительной информацией обращаться в отдел коммунального имущества и приватизации Гродненского городского исполнительного комитета по тел. 8-0152 74 14 42.
УНП 500048360

ОСТРОШИЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

проводит аукцион по продаже земельных участков в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания жилых домов

№ лота	Адрес земельного участка	Площадь, га	Наличие инженерный сетей (водоснабжение, электроснабжение). Наличие ограничений	Начальная цена (бел. руб.)	Задаток (бел. руб.)	Расходы по изготовлению документации (бел. руб.)
1	А/г Острошицы, ул. Зеленая, 10. Кадастровый номер 623286306601000531	0,15	Электроснабжение, водоснабжение (в стадии строительства)	40 513 500	4 051 400	13 021 100
2	А/г Острошицы, ул. Зеленая, 12. Кадастровый номер 623286306601000532	0,1496	Электроснабжение, водоснабжение (в стадии строительства)	40 405 500	4 040 600	13 461 600
3	д. Бояры, ул. Солнечная, 10а. Кадастровый номер 623286301101000065	0,1051	Электроснабжение, водоснабжение. Ограничения: 0,0027 в связи с расположением в охранной зоне ЛЭП до 1000 вольт, 0,1051 в водоохранной зоне реки Веснянка	22 212 300	2 221 200	14 038 500

Аукцион проводится **24 августа 2015 года в 10.00** в здании Совета, документы принимаются ежедневно **с 8.00 до 17.00 кроме субботы и воскресенья по 18 августа 2015 года включительно.** Ксерокопия паспорта и квитанция об оплате задатка обязательны. Задаток перечисляется на расчетный счет 3600619141101 в ЦБУ 611 ф-ла № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», код 153001501, УНН 600181707. Код платежа 04901. Получатель — Острошицкий сельисполком. Победитель обязан в течение 10 дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и оплатить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Телефоны для справок: 8 (017) 745-76-21, 8 (017) 745-76-35.

Моваю душы

Настасся НАРЭЙКА:

«Я КРОЧУ ПА ЧАСЕ, НІБЫ ПА ВАДЗЕ...»

Трымаю ў руках зборнік вершаў маладой паэткі Настассі Нарэйкі, якую нядаўна прынялі ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Пазнаёміўшыся з яе творчасцю, я адчула роднасную душу, таму што і сама з дзяцінства люблю пісаць — апавяданні, казкі і вершы. Яшчэ мару, як і яна, стаць журналісткай. У Камянец Насця трапіла пасля размеркавання, а нарадзілася ў Маладзечне, скончыла гімназію №10, у якой зараз вучуся і я. Нядаўна мне пашчасціла пазнаёміцца і пагутарыць са сваёй зямлячкай.

— Я пачала пісаць з дзесяцігадовага ўзросту. Памятаю, мне падабалася чытаць творы беларускай літаратуры, а потым я вырашыла паспрабаваць складаць вершы сама. Але запісвала іх чамусьці ў радок, як звычайны празаічны тэкст. Потым трапіла ў літаратурны гурток, і мне там растлумачылі, што вершы пішуцца не так. Першы мой верш быў прысвечаны Беларусі, а першай чытачкай і слухачкай была мама. Яна паслухала і спытала: «Гэта ты сама?» Напэўна, усе бацькі так пытаюцца...

Не ведаю, чаму, але цяпер мяне цікавіць тэма ўзаемаадносін чалавека з Богам. І я спрабую праз вершы з ім гутарыць.

— У вас выйшаў першы зборнік...

— Гады два таму Брэсцкае аддзяленне Саюза пісьменнікаў аб'явіла ў вобласці літаратурны конкурс. Пасля ўдзелу ў ім мяне запрасілі на свята «Лунінецкая восень» і прапанавалі выдаць зборнік вершаў. Я марыла пра ўласную кнігу вельмі даўно, а вось калі выпала такая магчымасць, чамусьці доўга сумнявалася. Шмат разоў перачытвала, нешта выкідала, нешта дадавала. Зборнік называецца «Магдэбургскае права маёй душы». Гэта амаль сугучна з назвай аднаго з вершаў. Кніга прысвечана ўнутранай свабодзе чалавека, праву яго душы на «самакіраванне».

Я знайшла сабе новы дэвіз, радкі з твора Караткевіча. Ён гучыць так: «Чалавек народжаны для бітвы і мае права памерці толькі ў бітве».

— Вы пішаце толькі па-беларуску?

— Я вучылася ў беларускамоўнай школе, і дома мы размаўляем на роднай мове. Потым, калі я паступіла ў Інстытут журналістыкі, у нас на курсе была выкладчыца Альбіна Рышардаўна Хрумчанка, якая таксама выкладала ўсе прадметы па-беларуску. Гэта такі чалавек, што пасля яе заняткаў грэх не гаварыць на роднай мове!

— Як да вас прыходзіць натхненне? Вы больш паэтка ці журналіст?

— Звычайна для таго, каб яно прыйшло, патрэбны новыя людзі, уражанні, сустрэчы. А што тычыцца журналістыкі... Напэўна, я і першае, і другое, а яшчэ я трошкі празаік: пішу апавяданні. Гэта ў чымсьці падобныя прафесіі. Бывае так, што прыязджаеш да чалавека, ён расказвае сваю гісторыю, а ты слухаеш — і не можаш паверыць. Хоць серыял здымай! Але ён просіць не пісаць пра гэта ў газеце. Тады прашу дазволу напісаць апавяданне, змяніўшы імёны герояў.

— Чым займаецеся ў вольны час?

— Вяду гурток па журналістыцы ў аддзяленні дзённага знаходжання для людзей пажылога ўзросту пры мясцовым Цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва. Расказваю пра тое, як трэба пісаць, як браць інтэрв'ю. Мы нават запісвалі на тэлефон радыёперадачу. Ёсць пенсіянеры, якія сапраўды ў гэтым зацікаўлены. Напрыклад, адна жанчына схадзіла адноўчы на канцэрт і ўжо на наступны дзень падрыхтавала заметку. Яна вельмі добра піша. Увогуле, з імі цікава, яны шмат ведаюць. Спачатку баялася, што не змагу знайсці з імі агульную мову, але нам заўсёды ёсць пра што пагаварыць.

Па вечарах я абавязкова звяртаюся да свайго дзённіка. Праводжу над ім ад некалькіх хвілін да некалькіх гадзін, у залежнасці ад таго, як прайшоў дзень. Дарэчы, калі не здарылася нічога асаблівага, запоўненых за адзін раз старонак чамусьці атрымліваецца больш. Я туды пішу не толькі пра тое, што адбылося, але і запісваю розныя свае ідэі. А потым з гэтага можа атрымацца апавяданне.

— А не было жадання весці інтэрнэт-дзённік ці блог, як гэта цяпер многія робяць?

— Для мяне галоўнае — рух рукі. Вершы і апавяданні спярша пішу толькі на паперы. Магчыма, справа ў тым, што калі друкуеш на камп'ютары, то можаш выправіць нешта ў любы момант, а на паперы гэта рабіць у нейкім сэнсе больш складана — таму ўзрастае адказнасць.

— Як бы вы сябе коратка ахарактарызавалі? Які ў вас дэвіз па жыцці?

— Я наіўная, напэўна. Думаю, гэтая рыса карысная для паэта і пісьменніка. Яшчэ рамантычная. Гэтая якасць таксама часам дапамагае. І адданая. Рабоце, Радзіме, справе, якая ў мяне ёсць.

Калісьці ў школьныя гады я пісала ліст для газеты «Раніца». Трэба было расказаць пра сябе і прывесці свой жыццёвы дэвіз. Тады я выбрала радкі Маякоўскага «Светить всегда, светить везде!». Мне здавалася, што ў гэтых словах ёсць нейкі дух бунтарства, характэрны для моладзі. А цяпер у мяне крыху змяніліся арыенціры. Я знайшла сабе новы дэвіз, радкі з твора Караткевіча. Ён гучыць так: «Чалавек народжаны для бітвы і мае права памерці толькі ў бітве». Увогуле, у Караткевіча ёсць кніга «Нельга забыць», якая цалкам можа стаць маім дэвізам.

— Што б параілі будучым журналістам?

— Вопыту трэба набірацца як мага раней. Мяркую, што калі б я не прыйшла некалі ў гурток па журналістыцы пры тагачасным Маладзечанскім цэнтры пазашкольнай работы, то не мела б столькі публікацый для паступлення. А калі вам патрэбна тэма для артыкула, часцей сустракайцеся з людзьмі. У іх могуць быць самыя незвычайныя лёсы...

Дар'я СВІРЫДА, выпускніца 10 класа гімназіі №10 г. Маладзечна.
Фота аўтара.

Уладзіміру Караткевічу

Ісці па галіне, якая спружыніць і гнецца
Пад нагамі. А неба ўсюды: звонку, унутры.
Ісці, і баяцца, і ведаць, што сэрца сарвецца,
Як яблык з галіны, і стукнецца вобзем: памры!

Ісці па галіне. Нячутна ў цемры гайдацца.
Зоры хаваць на грудзях, каб апёкі навек.
У гэтай вадзе, што ідзе, без канца люстравацца.
І ведаць, што свет нерэальны прыгожы, як здзек.

Ісці па галіне. Цемрай у коле святла.
Потым сарвацца і плыць, і ўліцца ў траву.
І чуць, і не верыць, і ведаць... Удары вясла.
Мроіцца толькі. Я дыхаю, веру, жыву.

Галіна звініць, бы струна. Аддаецца ў вушах.
Ноч адклікае назад свае чорныя войскі.
Знічкай сарвецца надзея. І сцішыцца жах.
Ляжаць, і маўчаць, і глядзець у сябе, як Загорскі.

Галіна кранецца гарачага злітка сонца.
Будзе рака свае воды ў неба нясці.
Устану. Пайду. Шчаслівая страшна, бясконца.
І будзе з душы маёй новае дрэва расці.

Магдэбургскае права тваёй душы

Ты не лічышся нават са мной.
Ты смяешся і робіш, як хочаш.
Я забыла пра сон і спакой,
Бо штурмую цябе дні і ночы.

Ты расставіў па вежах салдат,
А твой мост пад'язны, як прыбіты.
Не зраблю я і кроку назад.
Не чакай. Мы з табою спавіты.

Не жадаеш і слухаць мяне?
Мой адчай. Мой кароль ашалелы.
Не кахаеш? То гэта міне.
І ляцяць легкакрылыя стрэлы.

Апушчу, як у сне, арбалет.
Мне нашто заваёўніцы слава?
За цябе я аддам цэлы свет.
Клята будзь, магдэбургскае права!

***

Каласы, камяні і крыніцы...
Карагод, крыгаход, краявід...
За цябе я баюся маліцца,
Бо растанеш, як белы прывід.

Мова-казка і мова-загадка,
Разам з тым мова-крык, мова-боль,
Між любоўю і вечнасцю кладка,
Наш адвечны, забыты пароль.

Ты ж жывая! Згадаць нас прымусь!
Вер: не знікнеш, не згінеш дарэмна.
— Каго любіш?
— Люблю Беларусь.
— Божа мілы, як гэта ўзаемна!

Друкуецца ў «Маладосці»

Першыя свядомыя спробы пяра Дзмітрый Шулюк зрабіў у сёмым класе, але тады не атрымаў ніякай падтрымкі. Сапраўдным матывацыям для яго стаў малодшы брат Саша, для якога былі напісаны першыя казкі. Дзмітрый марыць, каб яго творы былі вечнымі і сапраўднымі і каб яны сталі для кагосьці кавалкам чыстага неба над галавой.

Дзмітрый ШУЛЮК

ПАЛЁТ

Гусак марыў пра нябёсы. Марыў з самага дзяцінства. З таго далёкага дня, калі ён, задраўшы дзюбу ўгору, прыгледзеўся і яму здалося, што там, у аблоках, ляцяць роўным ланцужком гусі. Хутчэй за ўсё, здалося, бо гусі не могуць лётаць. Гусі вельмі цяжкія. Іншая справа — вераб'і. Маленькія, шпаркія птушкі. Ім не трэба шмат сіл, каб узняцца ў паветра. Не трэба шмат сіл, каб заставацца з ім. Але ж кожнаму — сваё. Адны могуць лётаць, затое другія — могуць есці ўволю. І ўсё жыццё гусаку даказвалі, што тыя, другія, больш шчаслівыя за першых. Гусак сумняваўся, гусак не мог паверыць. Ён думаў, што яшчэ малады і таму ў яго такія думкі. Такія мары. Таму ў яго такія казачныя сны.

Сны. Астатнія гусі не бачылі сноў. І гусак не мог растлумачыць ім гэтую з'яву. Колькі б ён ні падбіраў словы, атрымлівалася, што ён проста хворы. Што менавіта хвароба і туманіць яго розум. Менавіта яна не дае яму радавацца жыццю.

Старэйшыя гусі (не нашмат старэйшыя, бо да старасці гусі не дажывалі — знікалі кудысьці) спрабавалі дапамагчы хвораму гусаку-рамантыку. Але не спраўляліся. Яго аднагодкі смяяліся з яго. А малых гусянят да дзівака не падпускалі, каб не сапсаваў. Вось так жыццё і ішло.

Пакуль аднойчы ўсё не змяніў адзін сон. Гусак зноў бачыў сябе ў небе. Ён зноў лётаў. Бачыў увесь свет інакш, увесь свет без межаў, увесь свет свабодным. Ён дыхаў гэтай свабодай, ён быў шчаслівым. Пакуль не пабачыў яе. Тую, якую кахаў. Яна не ляцела з ім. І ніколі б не паляцела. Для яе гэта было так незразумела, так дзіка, што нават у сне гусак не ўяўляў яе побач з сабой. Да гэтага самага сну зусім не ўяўляў. А цяпер уявіў. Убачыў яе, такую далёкую, бессэнсоўную белую пляму. Убачыў і спужаўся. Спужаўся, што не вернецца да яе. Спужаўся, што з кожным яго палётам адлегласць паміж імі становіцца ўсё большай. Спужаўся, што ім не быць разам. І забыўся, як лётаць. Без усякага толку махаў крыламі, але яны перасталі трымаць цяжкае гусінае цела ў паветры. Яны сталі бескарыснымі прыдаткамі па баках. Неба адмовілася ад гусака, адмовілася на карысць зямлі.

Гусак прачнуўся зусім іншым. Не такім, якім быў вечарам. Ён больш не хацеў лётаць, баяўся. Кожны дзень гэты страх адкусваў кавалкі ад былой мары, пакуль мара зусім не знікла. І гусак стаў шчаслівым. Шчаслівы ён еў уволю, гагатаў з дурных вераб'ёў. І шчаслівы падставіў шыю пад сякеру...

Эмілія Комар нарадзілася ў 1993 годзе, вучыцца на журналіста ў ГрДУ імя Янкі Купалы, захапляецца адзінаборствамі, натхняецца падарожжамі і загартоўваецца маржаваннем. У «Маладосці» дэбютуе маленькімі апавяданнямі, адно з якіх прапануецца чытачам «Чырвонкі».

Эмілія КОМАР

ГРУШКА

Скрыўленая на бок хата стаяла адна, нібы пакінутая сіротка, на ўзлессі, за некалькі соцень метраў ад невялікай вёскі. Маленькая, са старых бярвёнаў, яна дажывала свой доўгі век як пустэльніца, адна-адзінюткая. Яе гаспадыня, такая ж старая і ўсімі забытая бабуля, жыла ў ёй больш за паўсотню гадоў. Дзеці пораз'язджаліся па свеце, а з былой гаспадаркі толькі і засталіся, што пара курэй ды кволы стары певень. Гарода ўжо некалькі гадоў не трымала, бо на тое не было колішніх сіл. І толькі ля самай хаціны стаяла грушка — адзіная родная душа бабулі. Яна кожнае лета давала добры ўраджай смачных пладоў. На лавачцы каля грушкі старая і праводзіла амаль увесь свой час, седзячы ды нешта гаворачы гэтаму дрэву. Часта паглядала на верхавіну ды цяжка ўздыхала. Грушка была для яе даражэйшай за ўсё. Здавалася, яна лавіла і разумела кожнае слова старой, а ў адказ часам шапацела лісцем...

...У вёсцы бабулю іначай, як чараўніцай або вядзьмаркай, не звалі; ніхто нават дакладна не памятаў яе імя. Чамусьці лічылася, што яна займаецца рознымі чарамі, знарок накладае праклёны, наводзіць псоту... Таму ягады і грыбы мясцовыя ў тым баку не збіралі, бо лічылі іх сапсаванымі, ядавітымі. Да хаты старой ніхто не набліжаўся, а калі бабуля выходзіла да аўтакрамы, што прыязджала ў вёску два разы на тыдзень, то яе абыходзілі бокам, цураліся. І толькі адзін чалавек, прадавец гэтай крамы, вітаўся з бабуляй, гаварыў ветліва і проста. Раней, калі была яна крыху маладзейшай, аднавяскоўцы заўсёды імкнуліся яе абразіць, зневажалі, хаця і пабойваліся. Цяпер усе неяк звыкліся, не так звярталі ўвагу, проста моўчкі не любілі, а былі і такія, хто адкрыта ненавідзеў, думаючы, што прычынай усіх вясковых няшчасцяў была яна, вядзьмарка...

Іншадзін чалавек не памятаў, што быў час, калі яна ратавала хворых, дапамагала цяжарным, лячыла свойскую скаціну, збірала травы, сушыла, рабіла з іх лекі і аддавала ўсім, хто прасіў... Не памятаў ніхто і пра тое, што на вайне загінуў муж, што дзеці даўно выракліся роднай хаты і павыязджалі хто куды, забыўшыся на свае карані, на маці, зямлю... Людзі памяталі толькі адно: нібыта яна забіла дзіця. Хоць ніхто дакладна не ведаў, як тое было, ніхто не здагадваўся, што дзіця памерла, не нарадзіўшыся, таму што меўся толькі такі выбар: альбо загіне маці, якая павінна была нарадзіць, або дзіця, якое мусіла нарадзіцца... Старая пакінула ў жывых жанчыну, бо ў той было яшчэ чацвёра, якіх гадавала адна, без мужа... Ніхто не ведаў, але ўсе гаварылі і праклінялі...

...На пачатку восені, калі надышла пара збіраць садавіну, вясковыя дзеці залезлі на бабуліну грушку, абламалі сукі, паабтрасалі ўсё, пазбіралі грушкі, зламалі лаўку, што стаяла побач, разбілі маленькае акенца ў сенцах ды паразбягаліся. Для іх гэта была забава, нядобрая, але ўсяго толькі забава. А бабуля...

...У чацвер, як заўсёды, прыехала аўтакрама. Добры дзядзька Мар'ян, прадавец, не заўважыўшы старой, запытаўся пра яе ў вясковых... У адказ прагучала незадаволенае:

— Дык памерла старая, няма больш. Яшчэ і грошы з нас збіралі, каб іх чэрці, на пахаванне...

Вясной грушка не зацвіла...

SEX=БАЛЯСЫ

САМІ САБЕ ВАЛАЧКОВЫ

...Вось як было раней? Добры гаспадар ставіў новую хату, а затым капаў склеп пад бульбу і два калодзежы. Адзін з халоднай вадой, другі — з гарачай. Але потым тэктанічныя пліты ссунуліся, і цяпер капаюць толькі калодзеж з халоднай вадой. Эх, губляюцца традыцыі... І тыя ж народныя прыкметы адносна надвор'я ўжо амаль што не дзейнічаюць. Хіба толькі па прынцыпе: ходзіш на працу — горача, пайшоў у водпуск — дажджы. Або памыў машыну ці вокны — залева будзе. З іншага боку, з'яўляюцца новыя прыкметы, па якіх можна дакладна меркаваць не толькі пра надвор'е, але і пра многія іншыя падзеі ў нашым жыцці. Напрыклад, калі бачыце вялікія чэргі каля кас па продажы праязных білетаў, значыць, для многіх «нечакана» надышоў новы месяц. Калі каля газетных кіёскаў шмат моладзі і ўсе набываюць чорныя гелевыя ручкі — значыць, сёння ў краіне праходзіць цэнтралізаванае тэсціраванне. Ну а калі загаварылі пра дрэс-код у грамадскіх месцах, выходзіць, прыйшло сапраўднае цяпло. («Надышло лета. Астролагі прадказваюць, што колькасць экспертаў у інтэрнэце ў найбліжэйшы час імкліва скароціцца, таму што іх павязуць да бабуль у вёскі».)

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Вось і сёлета зноў, як толькі крыху прыпякло, пачалі гаварыць пра тое, што ў кабінет да чыноўніка ў шортах ці спартыўным адзенні не зойдзеш, бо ахоўнік можа не прапусціць. А ў больш шырокім сэнсе — пра культуру паводзінаў. («Апрані тое, у чым табе зручна». — «Але я не магу хадзіць у коўдры».) Ну як на гэта рэагаваць? Я таксама люблю хадзіць у шортах і шлёпках, але толькі ў вёсцы па сваім участку. У цэнтры горада ў такім «прыкідзе» не з'яўлюся, нават калі будуць моцна прасіць. А некага і прасіць не трэба, бо толькі так ён і можа вылучыцца. («Вось моладзь нахабная пайшла...» — «А раней як было?» — «А раней нахабнымі былі мы!») Таму абмяркоўваць гэтую тэму, прабачце, гэтак жа бессэнсоўна, як стыхійны гандаль у падземных пераходах (там таксама дапамагае толькі наяўнасць праваахоўнікаў, але ў кожным месцы іх не паставіш). Ці ўсё адно што забараніць Валачковай зноў і зноў заяўляць пра сябе.

Колішняя балерына, дарэчы, — таксама адна з «народных прыкмет», якая «працуе» круглы год. Там, дзе яна, заўсёды эпатаж. То Валачкова здымаецца ў бікіні, то без яго... («Ёсць такія жанчыны, якія з гонарам заяўляюць: «Я адна такая!» Глядзіш на яе і думаеш: «І слава Богу!») Вось нядаўна яна стала галоўнай «зоркай» моднага паказу — прайшлася па подыуме ў купальніку. Ды так, што Бары Алібасаў, які сядзеў у першым радзе, ледзь не выпаў з крэсла, спрабуючы сфатаграфаваць эфектна адтапыраную «пятую кропку» Валачковай. («Нехта створаны для кахання, хтосьці — для вялікіх подзвігаў. Ну, а іншы — выключна для таго, каб навакольныя маглі пасмяяцца».) Як гаварыў барон Мюнхгаўзен: «Дачка аптэкара — яна і ёсць дачка аптэкара». Прабачце, прыхільнікі таленту (ці чаго там яшчэ?) колішняй прымы. Як у тым анекдоце? «Я вырас у тыя часы, калі «буцік» быў проста бутэрбродам».

Такія паводзіны нашых прадстаўніц прыгожага полу — не болей, чым звычайнае жаночае какецтва. Ці тое самае жаданне вылучыцца, заявіць пра сябе любым спосабам.

Вось як мне пры такім выхаванні ставіцца да такой навіны? Паведамляецца, што ў апошні час шмат дзяўчат і жанчын пачалі адмаўляцца ад макіяжу ці скарачаць карыстанне касметыкай да мінімуму, каб выглядаць больш натуральна. Фатаграфіі жаночых твараў без макіяжу запоўнілі ўсе сацыяльныя сеткі (ну куды ж без іх). («Вадзік, а ты мяне не палохаешся, калі я без касметыкі?» — «Калі быць зусім шчырым, Люся, дык я цябе і з касметыкай пабойваюся».) У процівагу з'явіўся новы флэшмоб, удзельніцы якога не бачаць нічога страшнага ў тым, каб карыстацца касметыкай («Мне здаецца, што галоўнае правіла, калі малюеш брыво, — гэта своечасова спыніцца».) Усё пачалося пасля таго, як 21-гадовая візажыстка з Нідэрландаў выклала ў сеціве (вы заўважаеце, як усё напаказ?) фота і відэа, дзе яна нанесла макіяж толькі на палову твару. І панеслася... Ідэю падхапілі іншыя прадстаўніцы прыгожага полу і пачалі запаўняць свае старонкі такімі ж фотаздымкамі. І мне, як «чалавеку старой фармацыі» (словы Д'Артаньяна), адразу прыгадаўся Высоцкі: «Я не люблю, когда — наполовину/, Или когда прервали разговор/, Я не люблю, когда стреляют в спину/, Я также против выстрелов в упор»... Можна і больш мякка, але сэнс будзе такім жа. Памятаеце, як казаў Фіма з фільма «Госця з будучыні»: «У вашым узросце пара навучыцца маніць як след. Што за аматарства: я не бачыў, я не гаварыў...»? Гэта я да чаго хілю? Такія паводзіны нашых прадстаўніц прыгожага полу — не болей чым звычайнае жаночае какецтва. Ці тое самае жаданне вылучыцца, заявіць пра сябе любым спосабам. («Не маюць рацыі тыя, хто сцвярджае, што жанчыны самі не ведаюць, чаго яны хочуць. Выдатна ведаюць. Яны бачылі гэта ўчора ў краме...») Тым больш што самі ўдзельніцы флэшмоба ў выніку прызнаюцца: адным касметыка дазваляе адчуваць сябе больш упэўнена, іншым больш падабаецца працэс нанясення макіяжу. Што было ў выніку даказана? Відавочнае. Выйшла, як у чарговым анекдоце. «У школе. Настаўніца: «Сёння ў нас кантрольная». Бландзінка: «А можна карыстацца калькулятарам?» — «Можна». Другая бландзінка: «А табліцамі Брадзіса?» — «Можна. Так, дзеці, запішыце тэму нашай кантрольнай работы: «Адмена прыгоннага права».

...Ну, то і няхай, што дзяўчаты чарговы раз даказалі відавочнае. А чаму? Ды з тае простай прычыны, што кожная з прыгажунь можа сказаць пра сябе: «Я жанчына і таму кажу сваё рашучае «можа быць»... Гэта адна з самых дакладных «народных» прыкмет. Праверана.

Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.

«Трэба верыць у свае сілы!»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

Захапленне музыкай у кожнай з іх пачалося ў дзяцінстве, калі яны — з расчоскай альбо дэзадарантам замест мікрафона — ладзілі выступленні дома: уяўлялі вялікую сцэну і залу, поўную гледачоў. Потым па класічным сцэнарыі: наведванне музычнай школы, паступленне ў каледж, інстытут, дзе музыка была і застаецца іх нязменным спадарожнікам...

Таццяна: Іграю на фартапіяна, акардэоне і трохі на цымбалах. Але, ведаеце, я ніколі не думала, што буду пісаць музыку. У нас быў прадмет «Аналіз музычных формаў», які па складанасці можна параўноўваць з вышэйшай матэматыкай, таму і адчуванне многіх тонкасцяў прыйшло з часам. Потым аднойчы напісаны мной твор паслухаў паэт Іван Цітавец (ён працуе ў суаўтарстве з Ігарам Лучанком) і даў яму паглядзець на маю работу. Не скажу, быццам я вялікі майстар у такой справе, але імкнуся ў сваіх мелодыях дзяліцца часцінкай сваёй душы, расказваць пра свае пачуцці. У выніку я напісала гімн Траецкаму прадмесцю, які выконвае ансамбль «Свята». І гэта прыемна, калі можаш рэалізоўвацца і як малады кампазітар. Пішу музыку ў патрыятычным стылі для класічных і народных хораў.

Таісія: А ў мяне ўсё пачалося з таго, што я прыйшла да бацькоў і сказала: пайду вучыцца ў музычную школу (чым спачатку шакіравала іх). Але калі ўжо я сама была гатова ўсё кінуць, менавіта бацька адгаварыў мяне ад гэтага кроку. Ён хацеў, каб я спявала, займалася музыкай і развівалася ў гэтай сферы. Зараз я паралельна працую яшчэ ў адной групе, якая грае фолк — мы выконваем беларускія народныя песні ў сучаснай апрацоўцы ў суправаджэнні кантрабаса, гітары, флейты, баяна, джамбэя...

— Як вашы бацькі паставіліся да жадання зрабіць музыку прафесіяй?

Таццяна: У мяне маці — фармацэўт-правізар, таму заўсёды казала, што вучыць хімію і займацца адкрыццём новых лекаў — вельмі важная і запатрабаваная праца. Спрабавала туды мяне накіроўваць, але з часам я заўважыла, як мне падабаецца разблытваць розныя невядомыя сітуацыі (я сябравала з кампаніяй хлопцаў) і захацела стаць следчым. З узростам, праўда, пачала думаць пра тое, ці жаночая гэта справа? Прыехала ў Мінск, наведвала курсы МУС і ўжо разумела, што змагу паступіць... Але ў апошні момант вырашыла падаць дакументы ва Ўніверсітэт культуры. Дома пра маё месца вучобы даведаліся толькі праз паўгода, але я зусім не шкадую аб здзейсненні сваёй мары.

Ганна: Я ніколі не ўяўляла сябе ні ў якой іншай прафесіі. Нават у радзільным доме так гучна крычала, што ўрачы сказалі маці: верагодна, дачка ў вас будзе спявачкай. Мае бацькі мяне падтрымліваюць.

Марына: У мяне і бацька з маці, і бабуля (якая спявала ў народным хоры) хацелі, каб я займалася музыкай. Таму з таго часу, як мяне за руку прывялі ў музычную школу, музыка стала асноўным заняткам у маім жыцці.

— Раскажыце пра свае музычныя густы...

Таісія: Мой выбар музыкі залежыць ад настрою. Калі мне весела, то паслухаю нешта з такіх жанраў, як фанк і скай, а як раптам сумна робіцца, то ўратаваць зможа нешта рокавае (Led Zeppelin, Deep Purple). Люблю басанову, калі гаварыць пра тых, у каго можна нечаму павучыцца, то тут — імёны Білі Холідэй, Селін Дыён, якая проста нешта неверагоднае робіць на канцэртах голасам.

Ганна: Я аддаю перавагу эстраднай музыцы, таму мне імпануе творчасць такіх выканаўцаў, як Pink, Beyonce, Maroon 5. Люблю вельмі джазавую музыку, бо на ёй я вучылася.

Марына: З задавальненнем слухаю Christina Aguilera, Beyonce, але, бывае, і Білана Магу ўключыць...

Таццяна: Я таксама прыхільніца розных стыляў у музыцы. І вельмі важна якраз тое, дзе я магу нешта пачарпнуць для сябе як выканаўца. Таму на выбар песень уплываюць не толькі ўласныя густы, але і наяўнасць у іх цікавых новых хадоў. На расійскай эстрадзе мне падабаюцца Паліна Гагарына, Валерый Меладзэ, Леанід Агуцін, Пелагея. Сярод замежных выканаўцаў мае любімыя — Bon Jovi, Christina Aguilera, Beyonce, Shakira. Мне падабаецца, калі ў артыста пазнавальны голас. А пры жаданні расці і развівацца прафесійна і густы музычныя мяняюцца.

— А якую дзяўчыну можна лічыць у наш час прыгожай?

Ганна: Натуральную, без любога хірургічнага ўмяшання. Дзяўчаты (і мы не выключэнне) бачаць у інтэрнэце шмат інфармацыі пра тое, як даглядаць сябе, і імкнуцца да гэтага. Аднак галоўнае — прымаць сябе такой, якая ты ёсць.

Таццяна: Наконт прыгажосці скажу як чалавек, які пісаў па гэтай тэме дыпломную працу. Знешнасць нічога не вартая без унутранага напаўнення. Нават дзеці пішуць пра тое, што ляжыць змейка, і ў яе прыгожая лускавінка, але ўнутры яна ядавітая. Ці цукерка ў прыгожай абгортцы — не заўсёды смачная. Таму, на мой погляд, аснова — якраз прыгажосць унутраная. Паверце, яна абавязкова знойдзе адлюстраванне ў знешняй.

— Як гераіні прыгожай гісторыі, што можаце параіць тым, хто таксама марыць быць на сцэне?

Таісія: Самы галоўны мой здабытак на праекце Milki — вера ў сябе. Я набыла ўпэўненасць у тым, што магу дзяліцца чымсьці з іншымі. Таму не бойцеся набіваць гузакі. Вас могуць ацаніць адразу альбо доўга не заўважаць увогуле, але аднойчы абавязкова здарыцца ў вашым жыцці нешта грандыёзнае.

Ганна: Нічога не бойцеся і не станавіцеся крытыкамі на канапе. Бо бывае вельмі непрыемна натыкацца на заўвагі людзей, чытаючы якія разумееш: чалавек не рэалізаваўся ў жыцці і яму не застаецца нічога, як сядзець і «выказвацца».

Таццяна: Мары аднойчы абавязкова здзяйсняюцца, калі не апускаць рук, верыць у свае сілы і ісці да мэты. А калі вы станеце паспяховымі, то зможаце перадаць прывітанне ўсім тым, хто ў вас не верыў!

Алена ДРАПКО.
drapko@zviazda.by

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ №12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 287 17 41.
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Тыраж 20.569.
Нумар падпісаны ў 19.30 22.07.2015 г.

■ 50+: ЖЫЦЬ ЦІКАВА

«ВЫРАШЫЛА, ШТО ТАК ПРОСТА НЕ ЗДАМСЯ»

З Галінай Махаевай мы ўпершыню ўбачыліся больш за тры гады таму — на пасяджэнні групы ўзаемадапамогі анкапацыентаў. Памятаю першую думку: «Якая яркая, цікавая жанчына!» Да гэтага часу лічу яе прыгажуняй, нягледзячы на тое, што Галіне Васільеўне зараз 78 гадоў. Да таго ж, як аказалася, яркая ў яе не толькі знешнасць...

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

«У НАС ШМАТ ВЫДАТНЫХ ЛЮДЗЕЙ, І МНЕ ХОЧАЦЦА РАСКАЗАЦЬ ПРА ІХ ІНШЫМ!»

Галіна Васільеўна ўсё жыццё захапляецца мастацтвам і марыць аб'яднаць мастакоў і публіку. І не проста марыць, а шмат робіць для гэтага.

— Мне вельмі хацелася б, каб таленавітыя беларускія акцёры былі больш запатрабаванымі на тэлебачанні, каб неслі свой талент у масы, — кажа Галіна Махаева. — А то іх мала хто ведае. З'явіцца які-небудзь выдатны акцёр у тэлевізійнай праграме з нагоды свайго юбілею, яму папляскалі ў далоні... і на гэтым усё, зноў забыліся. А на тэлебачанні ў асноўным засілле эстрады, сур'ёзнае мастацтва амаль не прадстаўлена. Ёсць праграма Дамарацкага «Святло далёкай зоркі» на культурна-асветніцкім канале «Беларусь 3», але яна прысвечана акцёрам, якія ўжо пайшлі ад нас. А трэба распавядаць і пра жывых дзеячаў мастацтва!

Вось, напрыклад, хто стварыў новы чыгуначны вакзал у Мінску? Хто архітэктар новага будынка музея Вялікай Айчыннай вайны? Нацыянальнай бібліятэкі? Спытаеш — адкажа далёка не кожны. А гэта ўсё адзін чалавек — Віктар Крамарэнка, выдатны беларускі архітэктар. Ён лаўрэат міжнародных прэмій, прафесар Міжнароднай акадэміі архітэктуры. Нацыянальная бібліятэка Беларусі, між іншым, увайшла ў спіс 100 найцікавейшых будынкаў.

У свой час Галіна Махаева працавала дэканам факультэта грамадскіх прафесій. Раней былі такія факультэты ў ВНУ. «Мы студэнтам давалі другі дыплом: фатографа, журналіста, баяніста і г.д. Такое было ва ўсіх тэхнічных ВНУ, — распавядае яна. — Потым я перайшла чыста на выкладчыцкі хлеб. Выкладала эстэтыку і адчувала велізарнае задавальненне ад сваёй працы, ад зносін са студэнтамі!»

Галіна Махаева ўжо рыхтавала да абароны дысертацыю, як пачалася перабудова і давялося ўсё нанова перарабляць. Але ж свядомасць, светапогляд адразу памяняць немагчыма. «Шкадую, вядома, што не перарабіла асобныя часткі і не абаранілася, — кажа яна. — У мяне была вельмі цікавая тэма, звязаная з тэатральнай крытыкай. Калі працавала над ёй, добра пазнаёмілася з усімі нашымі тэатрамі — і сталічнымі, і абласнымі. З усімі рэжысёрамі і акцёрамі была знаёма...»

Пасля выхаду на пенсію, калі з'явілася шмат вольнага часу, яна стварыла клуб аматараў тэатра «Таленты і прыхільнікі». Гэта было ў 1979 годзе, пры сталічным Палацы ветэранаў.

— Мы праводзілі фэсты, конкурсы сярод артыстаў, — успамінае Галіна Махаева. — У кожнага тэатра свой рэпертуар, а маёй ідэяй было аб'яднаць акцёраў з розных тэатраў у нашых праектах. А таксама злучыць, зблізіць акцёраў і гледачоў-тэатралаў. У 90-х гадах тэатры былі паўпустымі і наш клуб быў неабходны. Нас прыходзіла 60 чалавек — гэта цэлыя два рады ў зале. І акцёры ўздыхнулі з радасцю: бо на іх спектаклі сталі хадзіць людзі, апладзіраваць, дарыць кветкі...

Зараз тэатральныя залы запоўнены. «Але тэатрам і сёння нялёгка, — разважае Галіна Васільеўна. — Яны павінны выжываць самі. А гэта значыць, трэба даваць розны рэпертуар. Некаторыя спектаклі ідуць на патрэбу гледача, але яны нізкапробныя. Гэта бяда. Гледачоў шмат, але якасць пагоршылася. Раней тэатр выхоўваў, а цяпер пераважае забаўляльны рэпертуар».

У ДАЧКІ — ТЭАТР АДНАГО АКЦЁРА

Гераіня нашага артыкула сама родам з Новасібірска. Як жа апынулася яна ў далёкім Мінску? Аказалася, дзякуючы каханню: аднойчы паехала адпачываць на Чорнае мора з сяброўкамі і пазнаёмілася там з мінчанінам. «У нас было вельмі прыгожае каханне — чыстае, рамантычнае... — Галіна Васільеўна міжволі ўсміхаецца, успамінаючы той час. — Я доўга не выходзіла замуж, усе выбірала...». І дадае з лёгкай какетлівасцю: «Гаварыць не буду, колькі мне гадоў было, але ўжо не 20. Праўда выглядала я добра, з гэтым было ўсё выдатна... І вось мне здалося, што гэта мой чалавек. Так наша знаёмства перарасло ў шлюб. Я прыехала да яго ў Мінск. Потым, на жаль, мы разышліся. Вынікам нашага кахання стала дачка. Зараз яна ўжо вырасла. Скончыла таксама, як і я, Інстытут культуры, такое ж аддзяленне — рэжысуры і акцёрскага майстэрства. Толькі я вучылася ў Маскве, а яна тут, у Мінску. Праўда, дачка не пайшла па тэатральнай лініі, але ў яе тэатр аднаго акцёра — працуе экскурсаводам і вельмі любіць сваю прафесію. Унук стаў кухарам. І ён таксама блізкі да мастацтва: хадзіў у тэатральны клас, скончыў музычную школу, фатаграфуе...

Ёсць праграма Дамарацкага «Святло далёкай зоркі» але яна прысвечана акцёрам, якія ўжо пайшлі ад нас. А трэба распавядаць і пра жывых дзеячаў мастацтва!

Галіна Васільеўна дагэтуль сябруе з многімі акцёрамі драматычных тэатраў, з опернымі спевакамі, мастакамі... «Пра іх трэба расказваць! — перакананая яна. — Таму ў кастрычніку мінулага года я стварыла новы клуб прадстаўнікоў творчых саюзаў, творчай інтэлігенцыі і аматараў мастацтва «Мастра». Я да яго вельмі доўга ішла... Давялося пісаць шмат лістоў разам з групай энтузіястаў — акцёрамі, рэжысёрамі, пісьменнікамі, паэтамі — у Міністэрства культуры, на тэлебачанне: дайце месца, дзе творчыя людзі маглі б мець зносіны! Раней быў Дом акцёра, а цяпер — нічога!

...Вось так мы сталі сустракацца раз на месяц у зале на 150 чалавек, які нам бясплатна прадаставіў Саюз мастакоў у Палацы мастацтваў на вуліцы Казлова. Ладзім там канцэрты, на якіх бясплатна выступаюць прафесійныя артысты. Кожны другі панядзелак да нас прыходзілі нашы пастаянныя гледачы. На лета мы зрабілі перапынак, але восенню працягнем працу.

...Мы хацелі б абмяркоўваць праблемы мастацтва ў рэжыме ток-шоу, на якія б запрашалі творчую інтэлігенцыю, прадстаўнікоў улады.

Хваробы баяцца ўсе: і хворыя, і здаровыя. Але яшчэ Фрэнсіс Бэкан казаў: «Няма нічога страшнейшага за сам страх!»

Маёй суразмоўніцы крыўдна, што наша беларускае мастацтва мала ведаюць. «Да нас едуць расійскія акцёры на антрэпрызы. А вось нашы беларускія акцёры ў Расіі амаль не запатрабаваны. Гэта праблема. Нас зараз у свеце ведаюць дзякуючы спорту. Але ж і беларуская культура вельмі багатая! Столькі таленавітых артыстаў, столькі творчых дынастый! А ў нас нават мастакі і акцёры не ведаюць адзін аднаго! Творчых саюзаў шмат, кожны з іх адасоблены. Іх трэба аб'ядноўваць, для гэтага і быў створаны наш клуб».

МАДОННЫ Ў КАЛЯРОВЫХ ХАЛАТАХ

У нашай гераіні заўсёды была актыўная жыццёвая пазіцыя, яна ніколі не сядзела на адным месцы. Вось толькі ў апошні час хвароба часам выводзіць са строю.

— Трэба лячыцца, трэба змагацца разам з дактарамі, — лічыць Галіна Васільеўна. — Калі я толькі прыйшла ў анкадыспансер і ўбачыла, колькі там хворых людзей... Памятаю, першая думка была: «Яны ўсе памруць. І я таксама памру...» Але я вырашыла, што так проста не здамся! А са сваіх уражанняў пазней склала аповед пра мадоннаў у каляровых халатах...

На жаль, захварэць можа кожны з нас у любы момант. «Трэба змагацца да канца, — упэўнена мая суразмоўніца. — Вядома, бываюць і сумненні, і адчай. Але здавацца нельга! І трэба больш гаварыць аб гэтай хваробе, каб пераадольваць страх перад ёю, таму што яе баяцца ўсе: і хворыя, і здаровыя. Але яшчэ Фрэнсіс Бэкан казаў: «Няма нічога страшнейшага за сам страх!»

Цяпер Галіна Васільеўна, акрамя ўсяго пералічанага вышэй, актыўны ўдзельнік групы ўзаемадапамогі для анкапацыентаў, якая з'явілася ў Мінску ў 2011 годзе. Разам з іншымі яна спрабуе развеяць страхі і міфы, якімі аброс рак. І сваім прыкладам даказвае, што можна жыць цікава, нягледзячы ні на ўзрост, ні на хваробу. Жыць поўным жыццём, у якім ёсць мастацтва, тэатр, цікавыя суразмоўцы, родныя людзі, паходы ў лес па ягады, пасядзелкі з сяброўкамі... А самае галоўнае — вера, надзея, любоў...

Святлана БУСЬКО.
busko@zviazda.by

■ Родныя тапонімы

ВАЎЧКІ І КАРАШАВА

Разгарнуўшы карту Мінскай вобласці, выпадкова знайшоў на захадзе ад сталіцы Ваўковіцкае вадасховішча, санаторый Ваўчковічы і дзве вёскі Ваўчковічы. Маё прозвішча Ваўчок. Вось мне і захацелася даведацца аб паходжанні майго прозвішча, а заадно згаданых вышэй населеных пунктаў і вадасховішча.

Аляксей Ваўчок,
аграгарадок Самахвалавічы Мінскага раёна.

Паважаная рэдакцыя! Я даўно хацела ведаць, чаму так называецца мая родная вёска Карашава былога Скідзельскага, а цяпер — Гродзенскага раёна. Недалёка, у Шчучынскім раёне, ёсць паселішча з такой самай назвай. На захад ад нас працякае рака Котра — быць можа, найменне пайшло ад яе?..

Нядаўна я прачытала кнігу Сяргея Токця і Мікалая Дзелянкоўскага «Скідзель і яго ваколіцы. Жывая гісторыя». Там распавядаецца, што было два Карашава — Вялікае і Малое (паходжанне назвы не тлумачыцца). Адно з іх стала называцца Белякова, а другое проста Карашава.

Буду вельмі ўдзячна, калі патлумачыце, адкуль паходзіць назва.

Яўгенія Кулевіч,
вёска Сялец Войстамскага с/с
Смаргонскага раёна Гродзенскай вобласці.

На вашы пытанні адказвае Ганна Міхайлаўна МЕЗЕНКА, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчыца кафедры агульнага і рускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Машэрава.

Інфармацыю пра паходжанне назвы Воўчкавічы выклаў яшчэ В.А. Жучкевіч у «Кароткім тапанімічным слоўніку Беларусі» (Мінск: Выд-ва БДУ, 1974): «***Воўчын*** — вёска Камянецкага раёна; ***Ваўчкі́*** — вёскі Вілейскага, Глыбоцкага і іншых раёнаў; ***Воўчкавічы*** — вёска Мінскага раёна чыгуначнай станцыі на лініі Мінск — Баранавічы. Назвы ўтвораны ад агульнай асновы — *воўк*, але паходжанне іх рознае: ад прозвішчаў (Воўчын, Воўчкавічы), непасрэдна ад назвы жывёлы, але часцей ад зарасніку *ваўчкоў*».

У адпаведнасці з сучаснымі поглядамі, непасрэдна ад назваў жывёлы найменні паселішчаў не маглі ўтварацца. У старажытны перыяд даволі часта імёны па назвах жывёлы прысвойваліся людзям па падабенстве да першых. Імя *Воўк* (памяншальная форма *Ваўчок*) — хцівым і каварным па характары. З цягам часу яно магло стаць прозвішчам, ад якога і паходзіць назва вёскі.

Тапонім ***Карашава*** можна суаднесці з цюркскім *кара* — 'чорны', 'злы', 'злы дух', ад якога магла ўтварыцца размоўная форма з даволі пашыраным суфіксам -аш- (параўнаем: Ваня — *Ваняша*), што ўжывалася ў якасці мянушкі. А ўжо з дапамогай далучэння да апошняй суфікса -аў- атрымалася прозвішча Карашаў, якое і лягло ў аснову назвы вёскі.

P. S. ***Шаноўныя чытачы! Вас цікавіць, што азначае назва горада, вёскі ці мястэчка, у якіх вы жывяце? А можа, той мясцовасці, адкуль вы родам? Вам хочацца ведаць, адкуль пайшлі найменні пэўных урочышчаў, лясоў, азёр, што размяшчаюцца ў вашай мясцовасці? Тады дасылайце свае лісты з пытаннямі на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага 10а, газета «Звязда» або на электронную пошту igumenski@mail.ru, з пазнакай «Ігуменскі тракт. Родныя тапонімы».***

■ Турпаход

ВЕДАЙ СВАЮ КРАІНУ

